72.186.318



# работніца і сялянка

5 1972



Анастасія Кузьмінічна Купрыянава з праўнучкай каля помніка сыну Пятру Купрыянаву.



Удваіх з сынам... Фота А. Кудраўцава.

# СПАТКАННЕ З СЫНАМ

Яна кожны дзень спяшаецца на спатканне з сынам. Не зважаючы на непагадзь, на боль у сэрцы і задышку, што прыйшлі з узростам. Што ні кажы — ёй сто гадоў.

— Добры дзень, Пецечка,— яшчэ здалёк вітае яна сына. Фартухом, па-сялянску, змахвае пылінкі з пастамента, папраўляе кветкі, што заўсёды пунсавеюць ля падножжа помніка. У шолаху дрэў, набрынялых сокамі, чуваць, здаецца, голас яе васемнаццацігадовага, меншанькага:

— Добры дзень, мама!

Сонечныя пырскі, быццам вяснушкі, разбягаюцца па бронзавым твары, запальваюць зорку Героя на грудзях. І здаецца Анастасіі Фамінічне, што сын вось-вось сыдзе з пастамента, прытуліць яе сівую галаву да свайго пляча, разгладзіць маршчынкі на твары. Але маўчыць, не варухнецца яе Пецечка. І ніколі не прыхіліць яе да сваіх грудзей, як не прыхіляць і чатыры старэйшыя сыны, якіх адабрала ў яе вайна.

Не наканаваў ёй лёс сустрэць сыноў-салдат: Коля і Сцёпа загінулі ў сорак чацвёртым, вызваляючы Польшчу. На год раней жудасная вестка прыйшла з Барысава: гестапаўцы закатавалі Мішу, які падтрымліваў сувязь з падполлем.

— Божа літасцівы, захавай жыццё двум апошнім сынкам, не дай адной дажываць старасці,— прасіла жанчына, прыслухоўваючыся да далёкай кананады, што набліжалася да Барысаўшчыны. Дачулася, што ў партызанскім шпіталі ляжыць яе меншанькі, Пецечка,— і рушыла туды, не зважаючы на ноч, на тое, што дарогі былі забіты гітлераўцамі. Што ёй нейкія сорак кіламетраў, што той страх!

Калі прабіралася праз калючыя зараснікі, у душы цеплілася надзея, што для Пеці вайна закончылася. Беларусь вызвалена, няхай па гаспадарцы памагае, у школу ідзе. А зазірнуўшы ў вочы сыну, зразумела: не закончылася для Пеці вайна. І для яе таксама не закончыліся трывогі.

— Не магу я, мама, сядзець склаўшы рукі. А нага... нічога, загоіцца ў паходзе.

Яна не настойвала на сваім, хаця і адчувала біду матчына сэрца. А праз некалькі месяцаў паштальён прынёс Анастасіі Фамінічне пакет. Яшчэ не раскрыўшы яго, жанчына адчула: з малодшым бяда здарылася. З Пецем.

«Паважаная Анастасія Фамінічна,— скрозь слёзы чытала яна.— Ваш сын яфрэйтар Купрыянаў Пётр Іванавіч загінуў смерцю храбрых у баі за Савецкую Радзіму. За геройскі подзвіг, здзейснены Вашым сынам Купрыянавым П. І. у барацьбе з нямецкімі захопнікамі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 24 сакавіка 1945 года прысвоіў яму найвышэйшую ступень адзнакі — званне Героя Савецкага Саюза...»

А пазней прыйшло пісьмо ад камандзіра часці, у якой служыў яе Пеця. З гэтага пісьма і даведалася Анастасія Фамінічна, што на латышскай зямлі яе меншанькі паўтарыў подзвіг Матросава, закрыў сваім целам амбразуру варожага дзота.

Пяты сын, Валодзя, памёр ад ран праз некалькі гадоў пасля вайны.

Колькі сілы волі, мужнасці патрэбна было, каб выжыць самой з-за нечалавечага гора! І не толькі вытрываць, але і застацца моцнай духам, выхоўваць ва ўнукаў, у іх аднагодкаў любоў да Радзімы, нянавісць да ворагаў. Яна часта выступае з успамінамі пра сваіх сыноў перад воінамі, вучнямі Жодзінскай школы імя Пятра Купрыянава, ля якой устаноўлен помнік Герою, заклікае іх расці мужнымі, смелымі, адданымі сацыялістычнай Айчыне, пільна ахоўваць яе свяшчэнныя рубяжы.

**У. КАСЬКО**

г. Жодзіна

Слова публіцыста

# СВЕТ ТВАІХ ІНТАРЭСАЎ

Дом стаіць на беразе Сожа, вокнамі глядзіцца ў блакітныя хвалі. Дом як дом, такіх многа ў Людагошчы. Але вяскоўцы вылучаюць яго сярод іншых. Бо ў гэтым доме пануе гасцінная сардэчнасць, і дзверы яго, як і сэрца гаспадыні, заўсёды адкрыты людзям.

Вынікамі яе працы захапляюцца ва ўсім раёне, ва ўсёй рэспубліцы. На ферму, якую яна ўзначальвае,— а калі гаварыць больш дакладна, дык не ферму, а сапраўдную фабрыку мяса (у мінулым годзе тут адкармілі звыш 5 тысяч свіней) — прыязджаюць павучыцца з іншых гаспадарак.

У калгасе «XXI з'езд КПСС» Мсціслаўскага раёна яе ведаюць як чалавека прынцыповага, спагадлівага, шчырага. Розным людзям памагае камуністка, актывістка жаночага савета, дэпутат.

Піянеры і камсамольцы запрашаюць яе на свае ўрачыстасці, уважліва слухаюць расказы ветэрана, з захапленнем глядзяць на зорку Героя Сацыялістычнай Працы, што ззяе ў жанчыны на грудзях.

Дваццаць пяць гадоў пражыла яна ў каханні ды згодзе са сваім мужам, выгадавала двух сыноў і дачку, але і сёння нібы тая дзяўчына, якую прывёз калісьці з-за Сожа Васіль Дземідзенка. Стройная, прыгожая, сінявокая. І ўсё яе цікавіць, і да ўсяго ў яе ёсць справа.

Свет інтарэсаў калгасніцы Марыі Мікітаўны Дземідзенка, пра якую я расказала вам, вялікі і неабдымны, як само жыццё.

Ён вялікі і неабдымны ва ўсіх нас, савецкіх жанчын. У кожнай — свой, багаты, часта непаўторны. Як непаўторны ён у маладой работніцы Раі Дзмітрачковай, у вопытнай даяркі Ніны Канстанці-

бел. 72.186.318

Слова публіцыста

наўны Чура, у былога штурмана, зараз служачай Кацярыны Ацабрык, пра якіх сёння апавядаюць старонкі нашага часопіса. І разам з тым вельмі многа агульнага аб'ядноўвае нашы думкі, учынкі, імкненні.

Перш за ўсё — гэта імкненне працай памнажаць здабыткі Радзімы. Працай швачкі і ўрача, настаўніцы і трактарысткі, інжынера і паэта.

Гэта любоў да нашай вялікай сацыялістычнай Бацькаўшчыны, да Камуністычнай партыі. Як самае святое мы носім яе ў сабе і перадаем новым пакаленням.

Гэта пастаянная прага ведаў, самаўдасканалення.

Кожная з нас вельмі хоча бачыць дружнай сваю сям'ю, шчаслівымі — сваіх дзяцей, імкнецца выхаваць іх вартымі людской павагі.

А хто з жанчын не марыць аб каханні? Такім, каб назаўсёды. Каб акрыляла, памагала на ўсіх жыццёвых скрыжаваннях.

Хочацца нам быць прыгожымі. Радуе нас і народная песня, і цікавая кніга, і першая пралеска на лясным ускрайку.

А штосьці і засмучае, прыносіць пачуццё незадаволенасці сабой, а іншы раз і разгубленасці. Бо не заўсёды адразу мы прыходзім да пастаўленай мэты. Не заўсёды ведаем, у чым яно, сапраўднае шчасце. Не заўсёды здольны ацаніць свае ўчынкі так строга, як цэнім, бывае, учынкі іншых. І нават любоў да ўласных дзяцей разумеем кожная па-свойму.

А які ён, крытэрый шчасця?

У чым прыгажосць чалавека?

З чаго пачынаецца гартаванне характару?

Як мы трымаем дадзенае слова?

Якое месца ў нашым доме займаюць мастацтва, паэзія?

Па гэтых і многіх іншых пытаннях, якія цікавяць жанчын, рэдакцыя нашага часопіса мае намер друкаваць публіцыстычныя матэрыялы. Мы будзем імкнуцца, каб новая рубрыка спадабалася вам, каб слова публіцыста дапамагала ў працы і пошуках, зацвярджала ў жыцці высокія прынцыпы камуністычнай маралі.

І ваш роздум на гэтыя тэмы, радкі вашых пісьмаў зробяць размову яшчэ больш яркай, усхваляванай, цікавай для вас, нашы чытачы.

**М. КАРПЕНКА**

Бд 5098

# РАЯ ДЗМІТРАЧКОВА І ЯЕ КАЛЕКТЫЎ

...Да адыходу поезда заставалася не больш як дваццаць мінут. Маладзёжная дэлегацыя Беларускай ССР ехала на форум моладзі і студэнтаў свету ў гонар 25-гадовага юбілею Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Шлях да Нью-Йорка не кароткі: спачатку да Масквы поездам, а там самалётам. Як і належыць пры развітанні, падарожнікі выслухоўвалі пажаданні сяброў і знаёмых. Тут я і пазнаёміўся з гэтай дзяўчынай, Раяй Дзмітрачковай. Яна была членам дэлегацыі.

...Маладзёжны форум адбываўся ў шматпавярховым будынку ААН. Яго адкрыццю папярэднічала антыкамуністычная прапаганда ў амерыканскіх газетах. «Жоўтая прэса» распаўсюджвала фальсіфікаваныя чуткі пра пасланцоў сацыялістычных краін. Нанятыя буржуазныя пісакі з ног збіваліся ў пошуках «кампраметуючых» матэрыялаў. Вось у такой абстаноўцы і адбылася першая прэс-канферэнцыя дэлегацыі Беларускай ССР. На яе з'явілася каля ста карэспандэнтаў амерыканскіх газет.

Мігценне ўспышак, рознагалосая гаворка і магчымасці любых правакацый могуць збянтэжыць кожнага чалавека. Рая Дзмітрачкова адчула некаторую разгубленасць. Толькі сакратар ЦК ЛКСМБ Н. С. Нерад і загадчык карпункта ТАСС Н. Н. Логінаў, людзі бывалыя, дружалюбна ўсміхаліся, нібы гаварылі: «Не трэба баяцца, трымайся!»

Карэспандэнты сыпанулі пытанні пра форум, яго мэты, састаў дэлегацыі. Вылучыўшы Дзмітрачкову для сваіх пытанняў, адна са спрактыкаваных журналістак, Бэці з «Чыкага ньюс», як яна прадставілася, павяла лабавую атаку.

— Як вы асабіста ставіцеся да вайны?

— Як я магу ставіцца да вайны, калі толькі ў апошняй з іх на маёй роднай зямлі загінуў кожны чацвёрты беларус, а ў Індакітаі кожны дзень паміраюць ні ў чым не вінаватыя людзі!

— Вы ж бачылі вайну толькі на малюнках?

— У мяне на вайне загінуў бацька...

— Вы, напэўна, з горада. Раскажыце пра сябе.



— Не, я з вёскі. Ёсць на Гомельшчыне, у Веткаўскім раёне, вёска Пыхань. Усяго 150 двароў. Людзі жывуць у поўным дастатку. Там у мяне маці Алена Сяргееўна. Цяпер яна на пенсіі. Сама я хадзіла ў садзік, школу-інтэрнат, затым вучылася на спецыяльных курсах у Гомелі. Цяпер працую ў брыгадзе зборшчыкаў на Гомельскім заводзе «Электраапаратура».

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

**работніца і сялянка**

№ 5 МАЙ 1972

ШТОМЕСЯЧНЫ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ І ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЧАСОПІС

ВЫДАННЕ ЦК КП БЕЛАРУСІ

ГОД ВЫДАННЯ СОРАК ВОСЬМЫ

Выдавецтва ЦК КП Беларусі



Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

— Што вы робіце ў вольны ад работы час?

— Усёй брыгадай ходзім у тэатры, кіно, турысцкія паходы, удзельнічаем у мастацкай самадзейнасці.

— Вы камуністка?

— Не, пакуль камсамолка. Але мару ўступіць у партыю.

Амерыканская журналістка не ўтойвала свайго расчаравання. «Смажанага» матэрыялу не атрымалася. Яркае, напоўненае вялікімі здзяйсненнямі і працоўнымі подзвігамі жыццё маладых прадстаўнікоў адной з Савецкіх сацыялістычных рэспублік выглядала яркім кантрастам у параўнанні з апалітычнасцю, абыякавасцю многіх маладых людзей на Захадзе.

Пачаўся форум. На агульных пасяджэннях і ў камісіях ішла барацьба за маладыя розумы. У агульных рашэннях форуму перамог пункт гледжання прагрэсіўнай моладзі, якая пратэстуе супраць вайны ў Індакітаі, ізраільскай агрэсіі на Блізкім Усходзе, выказваецца за адмаўленне ад вытворчасці і выкарыстання атамнай і іншай зброі масавага знішчэння, за супрацоўніцтва і дружбу моладзі ўсяго свету, за сацыяльную справядлівасць.

І зноў родная Беларусь. Я пабываў на Гомельскім заводзе «Электраапаратура», дзе працуе Рая Дзмітрачкова, гутарыў з яе сябрамі па рабоце.

Цэх магнітных пускальнікаў. Каля чатырох тысяч гэтых вельмі патрэбных прыстасаванняў для машын адпраўляецца штодня ў розныя гарады. Сакратар парткома прадпрыемства Іван Васільевіч Кузьмін расказвае:

— Маладзёжнае наша прадпрыемства. У цэхах у асноўным камсамольцы. Па працоўных поспехах адно з лепшых у Гомелі. Лічым гэта дасягненнем нашых партыйнай і камсамольскай арганізацый. Рая Дзмітрачкова ў нас працуе не першы год. Дапамаглі дзяўчыне авалодаць спецыяльнасцю слесара-зборшчыка. Рая аказалася вельмі здольнай работніцай. Адначасова яна вучылася ў вячэрняй школе. Цяпер — студэнтка хімікатэхналагічнага факультэта Гомельскага універсітэта, узнагароджана Ленінскім юбілейным медалем. Галоўнае ў характары Раі — працавітасць і сціпласць, крыштальная сумленнасць і прынцыповасць. Таму і абралі яе дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

Нядаўна Раю Дзмітрачкову прынялі ў члены КПСС, вылучылі ў састаў заводскага камітэта камсамола. Рэкамендацыю даваў сам Іван Васільевіч Кузьмін.

Простая дзяўчына, як і тысячы іншых. Любіць сваю работу, калектыў. Як дэпутат парламента яна цікавіцца рабочымі інтэрнатамі і адпачынкам моладзі горада, яе працай і бытам. Па вечарах вучыцца або ідзе ў тэатр. Выхаднымі і ў водпуск ездзіць да маці ў вёску. Хораша там: рэчка, лес, цёплы сырадой. Любяць маці і дачка спяваць вечарам беларускія народныя песні.

Рая Дзмітрачкова — чалавек новай фармацыі, камуністычнай. Чалавек, якому ўласцівы дзяржаўны падыход да ўсіх з'яў жыцця.

* * *

Дзяржаўны падыход. Адкуль такая рыса характару ў маладой дзяўчыны, якая толькі нядаўна ўступіла ў самастойнае жыццё? Можна сказаць упэўнена: ад калектыву, у якім жыве і працуе Рая.

Некалькі слоў пра завод і яго сённяшні дзень. Завод «Электраапаратура», яго прадукцыя займаюць сваё і вельмі важнае месца ў выкананні планаў пяцігодкі. Бо завод гэты выпускае тое, без чаго нельга ўявіць сабе ніводнага сучаснага прадпрыемства, — магнітную пускавую апаратуру, кнопачныя пасты кіравання і цеплавыя рэле. А для ўсіх нас — тавары шырокага ўжытку, тую электрычную апаратуру, без якой мы таксама не можам уявіць нашага побыту. Дык вось, калектыў гэтага завода вырашыў: за пяцігодку павялічыць аб'ём выпускаемай прадукцыі на 67%. І павялічыць толькі за лік росту прадукцыйнасці працы. А калі калектыў у цэлым бярэ на сябе такое высокае абавязацельства, то кожная брыгада, кожны ўчастак і кожны чалавек павінны зрабіць нешта большае, чым рабілі дасюль.

Зборачны цэх — той, у якім працуе Рая Дзмітрачкова, узяў на сябе такое абавязацельства: стаць цэхам высокай культуры працы. Ужо сёлета. А наступная вяршыня — стаць цэхам камуністычнай працы. І ў Раінай брыгадзе, якую ўзначальвае Марыя Ніхальчанка, шырокай плынню пайшоў новы пачын, народжаны планамі пяцігодкі: кожнай работніцы здаваць прадукцыю з першага прад'яўлення, без кантролю АТК, з асабістым кляймом. Так працуюць ужо Клава Каспяровіч, Валянціна Гаева і іншыя. Рая Дзмітрачкова была адна з першых, хто падтрымаў гэты пачын.

І яшчэ адна новая прыступка, якую адолее ў гэтай пяцігодцы завод. Ужо ў 1972 годзе ён дасць тавараў народнага ўжытку ў 13 разоў больш, чым у 1971.

**В. КУРАЧКІН**

# КРАІНА ЧЫРВ



**У Артэку сіняе-сіняе неба...**
**У Артэку сіняе Чорнае мора...**
**Там кіпарысы да неба і карпусы, нібы белыя караблі...**
**Там самыя звонкія песні і самыя шчаслівыя ўсмешкі...**
**Пра Артэк ведаюць дзеці ўсіх кантынентаў...**
**Артэк — гэта цудоўная краіна Піянерыя.**

**Дагарае апошні артэкаўскі касцёр. Заўтра імклівыя самалёты, хуткія паязды, павольныя рачныя параходы павязуць хлопчыкаў і дзяўчынак у розныя куткі нашай краіны і далёка за межы яе.**

**Застануцца на памяць артэкаўскія песні, застанецца дарагі сувенір — вугалёк з апошняга артэкаўскага кастра. Назаўсёды застанецца дружба, што нарадзілася ў сонечнай краіне чырвонага гальштука, дзе песні — піянерскія, кастры — піянерскія і клопаты — піянерскія.**

**Расце юны чалавек у чырвоным гальштуку, сталее. Уступае ў камсамол, з гонарам носіць партыйны білет камуніста. А гальштук — нібы пачатак шляху, нібы агеньчык, нібы вугалёк з таго піянерскага кастра, які разгараецца ў полымя вялікага прыгожага чалавечага жыцця.**

## НАШ ПРЫВІЛЕЯВАН КЛ

**Піянерскі парад.**



# ...НЬРВОНЫХ ГАЛЬШТУКАЎ

19 мая 1972 года ва Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна вялікае свята — яе 50-годдзе. Гэта свята і юных ленінцаў, хто павязвае чырвоны гальштук упершыню, і сівых ветэранаў — ганаровых піянераў, за плячыма якіх цэлае жыццё.

Гісторыя Усесаюзнай піянерскай арганізацыі непарыўна звязана з гісторыяй нашай краіны, нашай дзяржавы. Н. К. Крупская ўспамінала аднойчы: «Я памятаю, як 1 мая 1917 года выступіў на Марсавым полі дванаццацігадовы хлапчук, які працаваў ужо на заводзе, і гаварыў: «Гэта наша пралетарскае свята. У гэты дзень рабочыя ўсіх краін выходзяць на вуліцу і гавораць: «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» Капіталісты хочуць не плаціць нам за гэты дзень — прагулам яго лічаць. Мы не дазволім гэтага капіталістам».

...Шэсць елачак на Піянерскай вуліцы ў Ленінградзе паклалі пачатак новаму скверу. На гэтым месцы больш як 50 гадоў назад шэсць піцерскіх хлопчыкаў, як Гаўрош на парыжскіх барыкадах, падносілі снарады чырвонагвардзейцам.

...А на Марсавым полі, дзе магілы Ахвяр Рэвалюцыі, побач з героямі рэвалюцыіі пахаваны юны камунар Коця Мгебраў-Чакан. Яго імя навечна занесена ў Кнігу Гонару Усесаюзнай піянерскай арганізацыі.

...Ідзе спектакль першага рабочага рэвалюцыйнага тэатра «Легенда аб камунары». Ворагі абкружаюць жменьку парыжскіх рэвалюцыянераў. Тады на барыкадзе з'яўляецца худзенькая фігурка хлопчыка. У руках яго — пунсовы сцяг. Звонкім голасам хлопчык крычыць у залу, да гледачоў:

— Рэвалюцыя! Уперад, сябры камунары! Да перамогі, браты працы!

Зала замерла. Ніхто і не заўважыў, як да рампы праціснуўся пажылы чалавек у чорнай скуранай тужурцы. Ён узняў руку:

— Таварышы! Вораг падцягнуў сілы. Магчыма атака белых. Хутчэй усе па сваіх месцах! Баявая трывога...

Праз хвіліну толькі юны артыст застаўся ў памяшканні. У час баявой трывогі Коця абавязаны быў ахоўваць сцяг, з якім выступаў на сцэне.

Паездкі на фронт, выступленні ў Петраградзе ў шпіталях, на фабрыках, заводах, на караблях Балтыйскага флоту. Усюды гучаў звонкі голас Коці. 22 красавіка 1922 года контррэвалюцыянеры забілі юнага агітатара.

З самых першых крокаў арганізацыя юных ленінцаў расла і мацнела як арганізацыя палітычная, і заўсёды развяваўся над ёй побач з чырвоным сцягам чырвоны піянерскі гальштук — сімвал адзінства камуністаў, камсамольцаў, піянераў.

...1921 год. III з'езд беларускага камсамола прыняў рашэнне стварыць дзіцячыя камуністычныя групы. У дні работы з'езда ля будынка Цэнтральнага Камітэта камсамола Беларусі ўвесь час тоўпіліся дзеці.

— Запішыце нас у камсамол або ў камуністы! — прасілі яны.

Першы беларускі піянерскі атрад — «Беларуская дружына «Юны Спартак» імя Карла Лібкнехта нарадзіўся 20 чэрвеня 1922 года.

Дзе пачатак слаўнага лёсу многіх савецкіх людзей? Там, у далёкіх дваццатых гадах, калі дзеці, якія называлі сябе юнымі ленінцамі, упершыню адчулі і на ўсё жыццё запомнілі: піянер — гэта маленькі камуніст!

Важатай аднаго з першых сельскіх піянерскіх атрадаў на Талачыншчыне была ў 1923 годзе Маша Осіпава. Хто сёння не ведае Героя Савецкага Саюза Марыю Барысаўну Осіпаву, мужную і смелую падпольшчыцу ў час Вялікай Айчыннай вайны!

Піянерскі важак, камуніст-падпольшчык Герой Савецкага Саюза Уладзімір Сцяпанавіч Амельянюк і Герой Савецкага Саюза Марат Казей, Валодзя Шчарбацэвіч і зусім юная Люся Герасіменка... Гэта пералічэнне можна прадоўжыць, і за кожным прозвішчам устане незвычайны чалавек — юны ці пасталелы, падпольшчык ці воін, піянер, камсамолец ці камуніст. Усім ім, як і кожнаму з нас, вельмі хацелася жыць, і ўсе яны, не задумваючыся, ішлі на подзвіг і на смерць, бо было ў іх характары штосьці такое, што вяло і акрыляла іх,— любоў да Радзімы, да свайго народа, вера ў перамогу. Яны былі акрыленыя вятрамі свайго піянерскага дзяцінства, сваёй камсамольскай маладосці.

Мінаюць гады. Падрастае юнае пакаленне, і прыходзіць момант, калі чырвоны піянерскі гальштук робіцца шчаслівым успамінам, калі на твае месца ў піянерскі строй уступае новы хлопчык ці дзяўчынка. Ім захоўваць і памнажаць слаўныя традыцыі, ім несці цяпер піянерскі сцяг.

У свой юбілей піянерыя нашай краіны рапартуе партыі, камсамолу аб выніках Усесаюзнага маршу піянерскіх атрадаў «Заўсёды гатоў!».

Гучаць над краінай звонкія піянерскія песні. І ўзнімаюцца рукі ў піянерскім салюце, каб на заклік да барацьбы за справу Камуністычнай партыі Савецкага Саюза адказаць усхвалявана і цвёрда: «Заўсёды гатовы!»

**Ірына УГАЛЬНІК,**
**рэдактар газеты «Піянер Беларусі»**

## ...АНЫ КЛАС...



Герой Савецкага Саюза лётчык-знішчальнік Барыс Іванавіч Коўзан сярод дзяцей.



Памагаем маме.



На арэлях.











**Маці.**

**Татаў матацыкл.**

**Цудоўна!..**

**Свавольнікі.**

**Манечка і Валечка.**

## Да Міжнароднага дня абароны дзяцей







Цікава!

Пакрыўдзілі.

Песня.

# НАШ ПРЫВІЛЕЯВАНЫ КЛАС...

Фота Г. Германа, Е. Коктыша, М. Барысенкі, У. Вяхоткі, Ч. Мезіна, І. Стэца.







Васьмікласніца Ірына Герасімчук — чэмпіёнка 5-й Спартакіяды народаў СССР па плаванню.

«А шлях далёкі, доўгі...»

Буду балерынай.

# ЗАВОД? НЕ—ФЕРМА!



Ніна Канстанцінаўна Чура.

Ніна Канстанцінаўна канчала даіць кароў, калі, задыхаўшыся, прыбег Валодзя. Ён кідаў позіркі па баках і не знаходзіў, каго шукаў. Маці падала голас:

— Што такое, сынок?

— А нічога. Томка прыехала! Вось толькі што. Аўтобусам.

Ніна Канстанцінаўна борздзенька падключыла даільны апарат наступнай карове, а сама схапіла вядзерца і падсела пад суседнюю. Спрытна захадзілі рукі, у вядро ўдарылі тугія звонкія струмені сырадою. Хацелася раней управіцца, каб хутчэй сустрэцца з дачкой. Старэйшая яна ў яе, на свой хлеб выбілася, як цяпер кажуць, спецыялістам стала. Які ён, гэты хлеб, як ёй жывецца на новым месцы? Калі б працавала ў сваім калгасе ці хоць у раёне, то і бацькам на душы спакайней было б, і яна нейкую палёгку і падтрымку часцей мела б. А так — дзе ж тая Брэстчына...

Яны з мужам, Мікалаем Сцяпанавічам, так і меркавалі, што дачка, закончыўшы Ляхавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум, застанецца ў родных мясцінах. А дачка нават свайго, што называецца, законнага пасля вучобы водпуску да канца не адгуляла. Усяго тры дні і пабыла дома. Ад сяброўкі па тэхнікуму тэлеграму атрымала: «Прыязджай неадкладна». Круціў бацька ў руках сіняваты бланк — навошта такая спешка? Тамара растлумачыла: яны з сяброўкай дамовіліся ехаць у адзін раён, можа трапяць нават у адну гаспадарку. Удзвюх і спарней, і весялей. І слова бацькоў было адно: «Едзь!»

Спатканне з дачкой аказалася не такім радасным, як уяўляла Ніна Канстанцінаўна. Тамара сядзела за сталом і безуважна гартала часопіс. «Э, відаць, нясоладка табе жывецца, калі ты як у ваду апушчаная», — падумала маці. Каб падбадзёрыць, весела сказала:

— Ну, хваліся, дачушка.

— Ат, няма чым хваліцца.

Мусіць, не ўсё ідзе на лад... Ніна Канстанцінаўна прыгадала той сакавіцкі ранак, калі Тамара ад'язджала ў Брэст. З хаты яны выйшлі разам: маці — на ферму, дачка — у дарогу. Тамара штохвіліну падганяла, увесь шлях да аўтобуснага прыпынку подбегам і подбегам. Які цудоўны настрой быў у дзяўчыны, яна проста свяцілася ад шчасця. А сёння — як падмянілі. Што ж там у яе здарылася?

А здарылася тое, што яшчэ нярэдка бывае на першых кроках у маладога заатэхніка. Ферма не механізаваная, з даяркамі нелады — і адразу адпала ахвота працаваць.

Калі дачка расказала ўсё гэта, Ніна Канстанцінаўна ажно рукамі ўспляснула:

— І гэта ўсёй бяды той? А вось з людзьмі трэба памяркоўна, па-добраму...

— Табе лацвей казаць, у вас завод, а не ферма, — ускіпела дзяўчына. — А каб ты была на маім месцы...

## АТРАД МЕХАНІЗАТАРАЎ ПАПОЎНІЎСЯ

Дружна адгукнуліся жанчыны калгаса «Свіслач» Гродзенскага раёна на заклік партыі авалодваць механізатарскімі прафесіямі. Калгас «Свіслач» — эканамічна моцная гаспадарка. Адных трактароў і збожжаўборачных камбайнаў тут больш за пяцьдзесят, на фермах устаноўлены дзесяткі механізмаў. Але кадраў механізатараў не хапала. Большасць трактароў працавала ў адну змену, многія механізмы на жывёлагадоўчых фермах прастойвалі.

Год назад 27 калгасніц — жонкі трактарыстаў, шафёраў, загадчыцы ферм, паляводы і жывёлаводы вырашылі вучыцца ў філіяле Берастовіцкага сельскага прафтэхвучылішча № 37, які адкрыўся ў калгасе. У калгаснай механічнай майстэрні быў абсталяваны вучэбны клас. Калгас набыў падручнікі па трактарах і сельскагаспадарчых машынах, наглядныя дапаможнікі. Многія курсанткі ўжо былі знаёмы з тэхнікай. Так, Ірына Казіміраўна Станеўская, маці пецярых дзяцей, не адно лета працавала з мужам механізатарам і ўжо нядрэнна ведала трактар. Добра займаліся Рэгіна Антонаўна Цыдзік і Рэгіна Антонаўна Занеўская, Марыя Іванаўна Цыдзік, былы кінамеханік Люцына Антушэвіч і іншыя.

І вось год мінуў. Ідзе экзамен. Старшыня экзаменацыйнай камісіі Мікалай Якаўлевіч Ярмолеўскі запрашае браць білеты.

Першай адказвае Тамара Кузьмічна Пакачайла. Праверка тэхнічнага стану трактара, запуск рухавіка — пытанні знаёмыя. Ацэнка «выдатна» развеяла пачуццё няўпэўненасці. Пачатак добры. Калі Тамара Кузьмічна выйшла з класа, яе павіншавалі сяброўкі, муж.

Адказы па тэорыі ў большасці грунтоўныя, вычарпальныя. На «выдатна» адказваюць на ўсе пытанні Клеранціна Іванаўна Бергель, Рэгіна Антонаўна Занеўская, Тэрэза Station Станіславаўна Станеўская. Яны ўпэўнена адчувалі сябе і пры здачы практычнага ваджэння трактара.

Чатыры выдатныя ацэнкі, 20 добрых! Экзаменатары задаволены.

Экзамен закончаны. 27 калгасніц у адзін дзень сталі механізатарамі.

Праз некаторы час жанчын зноў запрашаюць у клас. Іх віншуе з заканчэннем вучобы і паспяховай здачай экзаменаў старшыня калгаса «Свіслач» Іосіф Іосіфавіч Кузьміч. Ён уручае жанчынам пасведчанні трактарыста-машыніста трэцяга класа. Адны з іх павядуць трактары, другія будуць абслугоўваць механізмы і машыны на жывёлагадоўчых фермах, выраблячь вітамінную муку на агрэгатах «АВМ-0,4». Цяпер можна будзе наладзіць работу трактароў у дзве змены і прадукцыйна выкарыстаць усе механізмы на фермах, збожжаскладзе.

**В. РАБЦАЎ,**
**інжынер-механік**

— Была, дачушка, была, — спакойна адказала маці і, уздыхнуўшы, дадала: — Што ж, слухай...

Цяпер даяркам «Рассвета» зайздросцяць жывёлаводы іншых гаспадарак. Дабротныя, тыпавыя памяшканні. Поўная механізацыя, чысціня, парадак. Можна ў туфліках працаваць.

У калгас часта прыязджаюць дэлегацыі нават з іншых абласцей і рэспублік. Чаго прыязджаюць? На семінары, нарады, прасіць высокаўраджайнага насення. Едуць людзі пераняць вопыт, павучыцца гаспадарыць. А павучыцца ёсць чаму. Толькі летась з кожнага гектара атрымана па 47,3 цэнтнера збожжа. Кажуць, гэта самая высокая ўраджайнасць не толькі ў раёне ці вобласці, а ва ўсёй рэспубліцы. А вазьміце бульбу. Многія скардзяцца: засушлівы, неўраджайны быў на яе мінулы год. У нашым калгасе дала бульбачка па 275 цэнтнераў на круг.

Кожны раз, калі госці знаёмяцца з гаспадаркай, хто-небудзь з іх абавязкова спытае, паказаўшы на беласнежныя будынкі:

— А гэта што ў вас — завод?

І пачуе ў адказ:

— Не, гэта наша ферма. Ці, больш дакладна, — жывёлагадоўчы комплекс.

Не кожны паверыць на слова — абавязкова пойдзе паглядзець. Што ж, ахвотна пакажаш яму свае ўладанні. А заадно пакажаш і старыя, драўляныя кароўнікі, што стаяць побач. Дзівіся, параўноўвай, чалавеча, што мы мелі раней і што маем цяпер...

...У адным з гэтых трох кароўнікаў трынаццаць гадоў назад і пачала сваю працоўную біяграфію Ніна Канстанцінаўна Чура. Дагэтуль яна была льнаводкай і нават думкі не мела ісці на ферму. Але выклікаў яе былы старшыня калгаса Васіль Аляксандравіч Глебка і павёў такую гаворку: хочам тваю старэйшую сястру Надзю паслаць вучыцца на заатэхніка, ды ніяк замены на ферме ёй не знойдзем. Выручай сястру, Канстанцінаўна!

Падумала, з мужам памеркавала і рашылася: пайду. І сястру трэба выручыць, і заробак у даярак большы, чым у льнаводаў. А грошы тады патрэбны былі — якраз дом новы задумалі будаваць.

— Цяжка было? — спыталася Тамара.

— Канечне, нялёгка! І даіць, і паіць, і карміць, і гной выкідаць — усё рукамі, за дзень так натупаешся, што рукі і ногі гудуць, нібы слупы тэлеграфныя. Ды які там дзень — пойдзеш на дасвецці і вернешся апоўначы. А пачнуцца ацёлы — днюеш і начуеш у кароўніку.

Праўда, старшыня ніколі не абмінаў кароўнікаў. Зойдзе, пагаворыць, паспачувае і абавязкова суцешыць. «Дайце час, дарагія жанчынкі, будуць вам і лепшыя кароўнікі, і механізацыя — усё будзе».

— Калі? — наступаюць даяркі.

— Я ж і кажу: дайце час, — супакойваў іх старшыня.

Цяпер ёсць такія кароўнікі. Не адзін — аж чатыры, цэлы жывёлагадоўчы комплекс. Тут і механізацыя, і гарачая вада, і душ. Усе ўмовы, усе выгоды. Але імі трэба яшчэ ўмець карыстацца.

Ад некаторых нашых даярак часам можна пачуць:

— Што мне з той механізацыі? І цяпер, як раней, даю ўручную.

— Бо сама вінавата, — адказваю ёй.

— Добра табе гаварыць, у цябе каровы паслухмяныя!

— Многія думаюць, што механічнае даенне — гэта зусім проста: падключыў апарат — і хоць газету чытай. А колькі было спачатку клопату, пакуль прывучыла кароў да даільнага апарата! Першацёлкі асабліва наравістыя, злосныя — не падступіся. І з аднаго боку падыходзіш, і з другога, і лустачкай хлеба пачастуеш, а яна не дае малака — і ўсё. Смех і гора. Іншы раз абрыдне ўсё гэта да гаркаты і думаеш: не хочаш — і не трэба. Але астынеш, супакоішся: «Людзі слана вучаць танцаваць, а карова ўсё-такі — хатняя жывёліна». І зноў пачынаеш «дрэсіроўку».

У нашым калгасе жывёлаводы зарабляюць добра. Летась у мяне ў сярэднім на месяц выйшла 180 рублёў. Надой — звыш 4 тысяч кілаграмаў ад каровы. На конкурсе даярак мне, нібы сваццi якой, павязалі шырокую чырвоную стужку з надпісам: «Чэмпіён раёна» і ўручылі Грамату райкома партыі і райвыканкома. Сёлета хачу па 4500 кілаграмаў малака атрымаць ад каровы.

Вось так, дачушка, нішто само не прыходзіць, нішто лёгка не даецца...

...Раніца выдалася цёплая, сонечная. У белай кіпені садоў шчыравалі пчолы. Як і тады, яны ішлі разам: Тамара — на аўтобусны прыпынак, Ніна Канстанцінаўна — на ферму. Мінулі знаёмы масцік, маляўнічы шчыт, на якім значылася, што калгас у 1972 годзе, у другім годзе новай пяцігодкі, атрымае на 100 гектараў сельгасугоддзяў па 850 цэнтнераў малака. Прайшлі вуліцай і неўзабаве былі на прыпынку. Дачка засталася чакаць аўтобуса, а маці напрасткі, цераз зялёны, квяцісты ўзбалотак, заспяшалася на ферму.



**Сустрэліся добрыя суседзі — хлеборобы з латышскага саўгаса «Эзерніене» і беларускага саўгаса «Коханавічы» Верхнядзвінскага раёна.**

**І. БРАЛКА**

**Калгас «Рассвет», Навагрудскі раён.**

НАЙБАГАЦЕЙШЫ па сваіх прыродных умовах край Грузінская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка... У мінулым каланіяльны прыдатак царскай Расіі, яна пры дапамозе вялікага рускага народа, усіх народаў-братоў нашай краіны дабілася нябачаных дасягненняў ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці.

Усе поспехі ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве, сапраўды велізарныя эканамічныя і культурныя пераўтварэнні, якія адбыліся ў Грузіі за гады Савецкай улады, грунтуюцца на моцным фундаменце новых, сацыялістычных адносін паміж людзьмі, на дружбе і раўнапраўнасці народаў нашай краіны, узаемнай дапамозе, пастаянным абмене і ўзаемнай зацікаўленасці ў справах.

Яшчэ на зары Савецкай улады Уладзімір Ільіч Ленін падкрэсліваў, што наша грамадства пайшло б далёка наперад да прагрэсу, калі б у яго жыцці актыўны ўдзел прымалі жанчыны.

Атрымаўшы доступ да асветы, да вяршынь ведаў, роўныя правы з мужчынам, грузінская жанчына заняла пачэснае месца ў грамадстве. Сорак працэнтаў агульнага ліку дэпутатаў мясцовых Саветаў рэспублікі складаюць жанчыны. 125 жанчын выбраны дэпутатамі Вярхоўнага Савета Грузінскай ССР, а сярод дэпутатаў Вярхоўнага Савета СССР ад нашай рэспублікі — 21 жанчына. Сярод іх — міністры, намеснікі міністраў, старшыні гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных, дырэктары фабрык і навукова-даследчых інстытутаў, старшыні калгасаў і дырэктары саўгасаў.

Больш як 400 жанчын Грузіі ўдастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы, больш за 24 тысячы — узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР. Неўміручай славай пакрыты імёны жанчын-грузінак герояў Вялікай Айчыннай вайны Зоі Рухадзе і Ціnацін Іосебідзе...

Плённа працуюць нашы жанчыны ў сферы матэрыяльнай вытворчасці, у галіне навукі і культуры. Яны складаюць 40 працэнтаў агульнага ліку работнікаў, занятых у народнай гаспадарцы, культуры, мастацтве, медыцыне. У галіне аховы здароўя і асветы 70 працэнтаў жанчын. Больш палавіны студэнтаў і навучэнцаў рэспублікі — таксама жанчыны. 69 жанчын носяць званне доктара навук, а каля 400 — кандыдаты навук...

Жаночыя саветы, створаныя на прадпрыемствах і ва ўстановах рэспублікі, у агульнадзяржаўным плане вырашаюць праблемы палягчання хатняй працы, развіцця сеткі дзіцячых устаноў, паляпшэння бытавых паслуг і грамадскага харчавання, а таксама ўмоў работы на прадпрыемствах, дзе шырока выкарыстоўваецца жаночая праца...

З даўніх часоў існуе прыказка: «Чалавек — каваль свайго шчасця». Але, на жаль, далёка не заўсёды жанчына да рэвалюцыі магла дастасаваць яе да свайго лёсу. Само паняцце шчасця было абмежавана: яно вылівалася для жанчыны



толькі ў вузенькую ручаінку сямейных радасцей.

А аказалася — колькі нерастрачанай творчай энергіі таілася ў гэтых пяшчотных жаночых душах, колькі сілы было ў тонкіх руках!

Але нямала забабонаў трэба было пераадолець для таго, каб даказаць свае права на належнае месца ў грамадстве. Актрыса, настаўніца — гэта было яшчэ не дзіўна ў дарэвалюцыйнай Грузіі, дзе жанчына заўсёды імкнулася ўдзельнічаць у грамадскім жыцці сваёй краіны. Але жанчына-акадэмік, урач, інжынер, ужо не кажучы пра дзяржаўныя пасады, — аб падобных аспектах дзейнасці яна не магла і марыць.

Сёння імёны грузінскіх жанчын набылі шырокую славу. Напрыклад, селекцыянер Ксенія Бахтадзе з'яўляецца акадэмікам Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна і Акадэміі навук Грузіі, яе працы па селекцыі чаю шырока вядомы далёка за межамі нашай краіны.

Ніно Джавахішвілі, член-карэспандэнт Акадэміі навук Грузіі,





узначальвае Інстытут эксперыментальнай марфалогіі.

Доктар медыцынскіх навук Вера Вашакідзе — першы і пакуль адзіны ў нашай рэспубліцы таксіколаг з навуковай ступенню, яна першая даследавала ўплыў розных пестыцыдаў на генетычны апарат арганізма.

Ксенія Сіхарулідзе — заслужаны дзеяч навукі рэспублікі, загадвае кафедрай фалькларыстыкі Тбіліскага дзяржаўнага універсітэта.

Гэты спіс можна было б прадоўжыць да аб'ёмістай шматтомнай манаграфіі, старонкі якой раскажуць пра велізарны ўклад грузінскай жанчыны ў сучасную навуку.

А вось іншы характэрны шлях сённяшняй грузінкі — ад баязлівай вясковай дзяўчынкі да Героя Сацыялістычнай Працы, дзяржаўнага дзеяча. Этэры Саламонія ведае ўся Грузія: знатная ткачыха, працуе адначасова на 24 станках. У яе шырокія інтарэсы, якія выходзяць далёка за межы цэха, дзе яна працуе. Этэры цікавяць усе навіны шаўковага аб'яднання, партыйнае жыццё прадпрыемства, поспехі сябровак, многія з якіх — яе вучаніцы. Дэлегат XXIV з'езда КПСС, Этэры Саламонія прадстаўляла дзідскага раёна стаіць помнік Герою. Яго імя носіць калгас, адзін з самых перадавых у рэспубліцы.

Сямейную славу замацавалі Кетэван, жонка Грыгорыя, і дачка Вінары. Кетэван з таго самага дня, як муж пайшоў на вайну, бяззменна кіруе брыгадай чаяводаў, Вінары закончыла школу і пайшла ў брыгаду маці, хоць ведала: нялёгкая праца чаявода, а брыгадзір патрабавальны. Працавала і вучылася на агранома. Праз некалькі гадоў Вінары атрымала дыплом аб заканчэнні завочнага аддзялення шэйшай партыйнай школе пры ЦК КПСС. А цяпер яна адказны работнік ЦК ВЛКСМ.

Біяграфія Вінары Схулухія тыповая для сучаснай савецкай грузінскай жанчыны. Няхай не супадаюць асобныя дэталі ў біяграфіях калгасніцы і вучонага, прадзільшчыцы і педагога, актрысы і спартсменкі, але галоўнае ва ўсіх у іх адно — актыўны творчы пачатак.

Той самы творчы пачатак, які зрабіў такой папулярнай у нашай рэспубліцы Ніну Жванія — жанчыну, якая атрымала ў спадчыну ад









Фота Д. Якобашвілі.

# ЖАНЧЫНЫ СОНЕЧНАЙ ГРУЗІІ

**Вераніка СІРАДЗЕ,**
**намеснік Старшыні Савета Міністраў Грузінскай ССР**

**Гара Ужба.**

**Чабан.**

**Гэта яны — вось такія дзяўчаты — «вынянькваюць» цудоўны грузінскі чай.**

**Член-карэспандэнт Акадэміі навук Грузінскай ССР Н. Джавахішвілі.**

**Член-карэспандэнт Акадэміі навук Грузінскай ССР Т. Цэрэтэлі.**

рабочы клас нашай рэспублікі, яе працу, яе творчасць.

«Він ары» — па-грузінску азначае «Хто гэта»?

Так назвала сваю дачку Кетэван Схулухія. Вось вернецца з вайны муж, думала яна, адчыніць дзверы, убачыць дзяўчынку і спытае: «Він ары?» Ён жа пайшоў на фронт, калі жонка рыхтавалася стаць маці.

Але муж з вайны не прыйшоў. У студзені 1942 года, вяртаючыся з разведкі, ён быў схоплены і закатаваны фашыстамі. Пасмяротна Грыгорыю Схулухія было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У самым цэнтры сяла Рухі Зуг- Грузінскага сельскагаспадарчага інстытута.

Усякі рэкорд можна палепшыць — гэта добра ведаюць маці і дачка Схулухія. Пяць тысяч кілаграмаў чаю з гектара, шэсць тысяч, сем, дзевяць... З кожным годам колькасць сабранага чайнага лісту расла. Кожны кілаграм — гэта 2500 — 3000 чайных лісцікаў, а значыць 2500 — 3000 рухаў пальцаў...

У 1966 годзе да Вінары прыйшла вялікая слава: ёй было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Яе маці Кетэван Схулухія ўзнагароджана ордэнам Леніна.

Некалькі гадоў назад Вінары паехала ў Маскву вучыцца ў Вы- рэвалюцыйнага пакалення чысціню і непахіснасць ідэалаў, дабрату і нязломную волю.

Ніна Аўксенцеўна Жванія — намеснік мэра горада Тбілісі. Але камсамольскае юнацтва не адыходзіць ад яе і зараз, у 50 з лішнім гадоў, у галіну ўспамінаў. У камсамоле Ніна Жванія прайшла шлях ад піянерскай важатай да сакратара ЦК камсамола рэспублікі. Мужчыны-калегі дзівіліся логіцы яе рашэнняў, той катэгарычнасці яе ўчынкаў і адносін, за якой стаіць пастаянная гатоўнасць думкі да аналізу і ацэнкі.

І так ва ўсіх галінах: рэдактар часопіса, драматург Марыка Бараташвілі і дырэктар дзіцячага тэат-

ра Ірына Гоцырыдзе, народныя мастакі Грузіі Кетэван Магалашвілі і Елена Азвледыяні, народная артыстка СССР Верыко Анджапарыдзе, кінарэжысёр Лана Гагаберыдзе і чэмпіёнка свету па шахматах Нона Гапрындашвілі...

Усяго 50 гадоў назад рэспубліка расплачвалася золатам за паслугі замежных спецыялістаў, а сёння ў 36 краін свету экспартуе Грузія вопыт і веды сваіх спецыялістаў, у тым ліку вопыт і веды спецыялістаў-жанчын.

Пасланцы Грузіі — выдатныя інжынеры Натэла Мгалаблішвілі і Ламара Ахабадзе дапамагалі будаваць чайныя фабрыкі ў В'етнаме, харэограф Надзея Рашчэпкіна рыхтавала кадры для першага нацыянальнага балета Кубы, піяністка Этэры Папашвілі ўдзельнічала ў арганізацыі кансерваторыі ў ААР і больш як два гады працавала там канцэртмайстарам. Урач-гінеколаг Этэры Гванцэладзе была вядучым спецыялістам у Іраку.

І цяпер дзесяткі грузінскіх жанчын паспяхова працуюць за мяжой, аказваюць там навукова-тэхнічную дапамогу, дзеляцца вопытам арганізацыі асветы, навукі, аховы здароўя.

Іх дзейнасць — яркі прыклад таго, якія глыбокія пласты невычарпальнай творчай актыўнасці жанчын выкліканы да жыцця ў свабоднай сям'і савецкіх народаў.

## ПРАФЕСАР ЦІНАЦІН ЦЭРЭТЭЛІ

Імя заслужанага дзеяча навукі, прафесара Цінацін Васільеўны Цэрэтэлі шырока вядома юрыстам-тэарэтыкам і практыкам як у нашай краіне, так і за мяжой. Ёй адной з першых жанчын прысвоена ступень доктара юрыдычных навук, яна ў Савецкім Саюзе адзіная жанчына-прававед, якая носіць высокае званне члена-карэспандэнта рэспубліканскай Акадэміі навук.

Цяжка пераацаніць значэнне навуковых прац Ц. В. Цэрэтэлі для развіцця савецкай прававой думкі. Яе шматлікія даследаванні прысвечаны асноўным і найбольш складаным тэарэтычным праблемам: крымінальнай адказнасці, паняццю злачынства, віны і г. д. Глыбокае пранікненне ў самую сутнасць рэчаў, арыгінальны падыход — характэрная асаблівасць гэтых даследаванняў. Натхнёная прагрэсіўнымі і гуманнымі прынцыпамі, Ц. В. Цэрэтэлі імкнецца, каб навуковыя палажэнні, што распрацаваны ёю, адпавядалі сацыялістычнай маралі і пачуццю справядлівасці.

Цінацін Васільеўна Цэрэтэлі не толькі глыбокі даследчык, але і выдатны, чулы педагог. На працягу сваёй 36-гадовай дзейнасці на юрыдычным факультэце Тбіліскага дзяржаўнага універсітэта яна выхавала некалькі пакаленняў юрыстаў-практыкаў, шчодра перадае свае багатыя веды шматлікім вучням, аспірантам, маладым вучоным.

Некалькі гадоў Ц. В. Цэрэтэлі была дэканам юрыдычнага факультэта Тбіліскага дзяржаўнага універсітэта. Чатырнаццаць гадоў кіруе сектарам права ў Акадэміі навук Грузінскай ССР. Яна часта прымае ўдзел у міжнародных кангрэсах і сімпозіумах, дастойна прадстаўляе савецкую навуку за мяжой.

Побач з навуковай і педагагічнай дзейнасцю Ц. В. Цэрэтэлі вядзе інтэнсіўную грамадскую работу. Дзевяць разоў яе выбіралі дэпутатам Тбіліскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных, яна ўваходзіць у склад Камісіі па справах непаўналетніх пры Савеце Міністраў Грузінскай ССР, з'яўляецца членам рэдакцыйных калегій часопісаў «Сабчота самарталі» і «Сакартвелас Калі». За сваю шматгранную і плённую дзейнасць Ц. В. Цэрэтэлі ўзнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і медалямі.

**Міндыя УГРЭХЕЛІДЗЕ**

## ІНТЭРВ'Ю З НІНО ДЖАВАХІШВІЛІ

Інтэрв'ю з членам-карэспандэнтам Акадэміі навук Грузінскай ССР дырэктарам Інстытута эксперыментальнай марфалогіі, прафесарам Ніно Джавахішвілі было надрукавана ў грузінскім жаночым часопісе. Мэтай інтэрв'ю былі апошнія заняткі праслаўленага грузінскага вучонага. Прапануем урывак з гэтай гутаркі.

**Пытанне.** Вашы апошнія заняткі?

**Адказ.** Працую над сардэчна-сасудзістымі праблемамі. У нашым інстытуце вывучаюцца ўсе органы і тканкі, уключаючы самыя дробныя капіляры, але самая вялікая ўвага аддаецца забеспячэнню сэрца крывёю. Як вядома, з узростам забеспячэнне сардэчнай мышцы крывёю паніжаецца. Спрабуем падаваць кроў, хоць бы частковa, праз вену замест артэрыі. Вены падаюць сэрцу ўзбагачаную кіслародам кроў і даўжэй, чым звычайна, трымаюць яе там. Такім чынам адбываецца своеасаблівая кампенсацыя...

**Пытанне.** Якая асноўная мэта вашага пошуку?

**Адказ.** Замена пашкоджаных участкаў артэрыі іншым матэрыялам. Доследы паказалі, што замена пашкоджаных участкаў артэрыі штучным матэрыялам ненадзейная. І вось рашыла выкарыстаць матэрыял, узяты ў чалавека, — вену. Калі яе ўшыць у артэрыю, яна набывае ўласцівасці артэрыі.

Думаю, гэты метад будзе эфектыўны.

# ШЛЮБ ПА КАХАННЮ

Існуе строгае навуковае палажэнне: нічога выпадковага не бывае, усё мае свае прычыны. Аднак пры ўсёй навуковай бясспрэчнасці гэтага палажэння слова «выпадак» працягвае жыць у нашай мове ва ўсіх сваіх разнастайных формах. І гэта ніколькі не супярэчыць навуцы, а, наадварот, таксама мае сваю прычыну: вельмі часта і вельмі многае ў жыцці і ўчынках людзей здаецца нам выпадковым. Ну, скажам, выбар прафесіі. Ці не даводзілася вам, пабываўшы на прыёме ў няўмелага, няветлівага ўрача, са смуткам падумаць аб выпадковасці яго выбару прафесіі? Як дрэнна і яго пацыентам, і, напэўна, яму самому з прычыны таго, што ён у свой час не патурбаваўся сем разоў адмераць, перш чым адрэзаць! Разануў, не гледзячы і не думаючы. Чакайце! Дык вось яна, прычына гэтага «выпадковага доктара» — выбіраў сабе справу не па любові, не па схільнасці, ды і не выбіраў зусім, а ўзяў тое, што бліжэй ляжала... Значыць, і сапраўды, нічога выпадковага не бывае. Усё мае свае прычыны.

А якая ж прычына таго, што дзяўчына, якая вырасла ў «дамашнім, драўляным горадку» з адзіным каменным будынкам, закончыўшы дзесяцігодку, рашуча збірае чамадан (зімовыя рэчы — таксама!) і накіроўваецца ў Маскву, у архітэктурны інстытут? Заўважце: не ў які ўдасца, а іменна толькі туды — у архітэктурны! Бацька ў яе ўрач, маці — медсястра, і наогул у сям'і Масальскіх прафесія медыка з даўняга часу была амаль што традыцыйная. Усе прычыны быццам самі сабой сыходзіліся на тым, каб выпускніца Можчынскай сярэдняй школы Вера Масальская імкнулася да медыцыны. А яна сабралася ў дойліды. Чаму?

Магчыма, таму, што кіраўнік выяўленчага гуртка ў раённым Доме піянераў Яфім Георгіевіч Мангілеў калісьці таксама закончыў Маскоўскі архітэктурны, у той час ён меў яшчэ назву

Вхутэмас? Магчыма, глыбока запалі ёй у душу гутаркі з маці свайго аднакласніка Колі Барадзіна, якая горача і глыбока любіла і ведала мастацтва? А ці не магло стацца, што прычынай быў адзіны мураваны дом у драўлянай Можчы?.. Галоўнае, што прычыны былі, і грунтоўныя, калі любоў, якая на першы погляд выглядала нечаканай, захавалася на ўсё жыццё.

Да таго часу яна была ў Маскве адзін раз, яшчэ зусім дзяўчынкай, гадоў адзінаццаці. І памяць ад гэтай паездкі засталася сумная, бо ў Маскву яна ехала, а назад эвакуіравалася: пачалася вайна. Відаць, смутак гэтай разлукі нібы абвастрыў памяць, і зараз яна, ужо дарослая, нібы пазнавала тыя вуліцы Масквы, якія, здаецца, часта сніліся ёй у дзяцінстве. А можа яны і сапраўды ёй сніліся такімі, і цяпер яна пазнавала іх па тым падабенстве, якое надаецца рэчам памяццю сэрца? Яна блукала па гэтых ажыўленых вуліцах і завулках, ні на што на свеце не падобных, і толькі падобных на яе дзіцячыя сны.



Архітэктар Вера Масальская.

Сумненні і радасць падступілі да яе, калі яна ўбачыла натоўп такіх самых, як яна, дзяўчат і хлопцаў, што жадалі стаць архітэктарамі. І тут упершыню падумалася пра зімовыя рэчы ў яе чамадане, калі, можа стацца, ніякай студэнцкай зімы ў яе і не будзе. «Трэба ж быць такім нахабным чалавекам!» Падумалася і пра магчымую слабасць той школы малявання, якую яна атрымала ў сваёй сціплай Можчы. І ўсе яе пяцёркі страцілі цану і пачалі сарамліва азірацца вакол, шукаючы пацвярджэння сваіх паўнамоцтваў.

Усё, аднак, скончылася добра. Паўнамоцтвы яе «правінцыяльных» пяцёрак былі пацверджаны сталічнымі экзаменамі. Школа, пройдзеная ў Яфіма Георгіевіча ў сціплай Можчы, здолела паспяхова пастаяць за сябе. Зімовыя рэчы дачакаліся студэнцкай зімы. Але дзіўная рэч: сумненні і нясмеласць ужо ніколі надоўга не пакідалі яе. Яна нямала пакутавала ад гэтага, бачачы ў сумненнях і нясмеласці прыкметы сваёй творчай несамастойнасці. І толькі з цягам часу зразумела, што і сумненні і нясмеласць стаяць значна бліжэй да жывой справы, чым спакой і самаўпэўненасць. Уся справа ў тым, да чаго нас вядуць нашы сумненні: да новых пошукаў ці да адмаўлення ад іх наогул.

Школьніца Верачка, якая з лёгкім сэрцам укладвала зімовыя рэчы ў чамадан і накіроўвалася на «заваяванне Масквы», не ведала сумненняў, яна была ўпэўнена, што стане дойлідам, бо яна народжана, каб іх стаць. Архітэктар з васемнаццацігадовым рабочым стажам Вера Барысаўна Масальская не раз і не два на дзень вяртаецца думкай да таго, што ўжо як быццам вырашана, і зноў і зноў сумняваецца, правярае, прыкідвае, вывярае і нярэдка мяняе гэтае вырашанае на іншае, больш дасканалае... Не раз і не два на дзень прыходзіць у галаву думка, што сапраўдная творчасць ёй наогул не пад сілу, што яна здатная толькі на тое, каб капіраваць і пераймаць ужо знойдзенае іншымі... А калі яна бачыць ужо гатовы будынак, які ўзнік на зямлі па яе задуме, як ёй хочацца перарабіць яго нанава! І як шкада, што нельга, немагчыма архітэктару нанава перабудаваць свой будынак, як можа, напрыклад, пісьменнік знішчыць ці перапісаць твор. Памылкі архітэктара асуджаны на даўгавечнасць. Горкая думка. Але ж без гэтай пастаяннай прагі паправіць, дарабіць, дадумаць няма мастака!

Васемнаццаць гадоў назад яна атрымала дыплом і накіраванне ў Мінск, у Белдзяржпраект. Першай працай, у якой прыняла ўдзел малады архітэктар Вера Масальская, быў піянерскі лагер на возеры Нарач. Яго назвалі «Зубронак», і здарылася так, што пад гэтай назвай ён трывала ўвайшоў у яе творчую біяграфію. Ён жа, першынец, вызначыў і яе пастаянную архітэктурную схільнасць, якой стала архітэктура адпачынку.

З таго часу вельмі вырас і працягвае расці і ўдасканальвацца «Зубронак». Спраектаваны і пабудаваны дзесяткі іншых лагераў, санаторыяў і дамоў адпачынку. Усе яны, кожны пасвойму, запомніліся ёй і ўдачамі і засмучэннямі. Але да «Зубронка» пачуццё асобага роду. Ён першы экзаменаваў яе тым экзаменам, які нельга пераздаць, па той жа прычыне, па якой архітэктар не можа «перапісаць» свой твор. Ён быў і тым першым выпрабаваннем, якое прымушала зразумець, як цесна звязана дойлідства з тэхнікай, як непасрэдна і кроўна залежыць палёт фантазіі ад яе ўзлётнай пляцоўкі, ад пачуцця і разліку мастака, яго сэрца і розуму.

Калісьці, у даўнія часы «рукатворнага дойлідства», турботы архітэктара вычэрпваліся ў асноўным дасканаласцю форм яго тварэння, гэта значыць клопатамі пра Хараство. Ён мала прымушаў сваю вольную фантазію раіцца з тымі, хто будзе ўвасабляць яе ў рэчаіснасць. Ведаў, што будуць будаваць так, як ён, дойлід, намаляваў. Цяперашні архітэктар, малюючы, абавязкова мае перад сабой умову задачы, пастаўленую сучаснай тэхнікай. І ён абавязаны свае «хачу» ўзгадніць з тым «магу», якое дыктуюць яму ўмовы задачы.

Гаварыць пра архітэктуру, не гаворачы пра хараство, немагчыма. Інакш архітэктуру не лічылі б мастацтвам. Кожны будынак павінен быць прыгожы. Гэта першая запаведзь дойліда, з якой ён выходзіць. Кожны будынак. Але ж ёсць і іншы, не менш важны бок пытання: будынак павінен быць зручны. Усякі. А прызначаны для адпачынку? Тым больш! Ёсць і трэці бок: будынак не павінен каштаваць вельмі дорага. Ёсць і чацвёрты: яго архітэктура не павінна ўваходзіць у супярэчнасць з навакольным асяроддзем. І пяты: лічыцца са стандартызацыяй сучаснага домабудавання. Ёсць і шосты, і сёмы, і соты... І ўсе іх трэба ўлічыць, каб паспяхова злучыць Хараство з мэтазгоднасцю, прымусіць іх сябраваць. І дзе, скажыце мне, у якой скарбонцы, у якой кладоўцы душы захоўваюцца тая цярплівасць, тая ўпартасць, тая паваротлівасць думкі, якія праз цяжкія будні пошукаў вядуць да рэдкіх знаходак?

Дзе тая кладоўка душы? Калі Вера Барысаўна думае пра гэта, яна ўсякі раз успамінае свайго бацьку, доктара Масальскага. Успамінае тым часцей, чым сталейшая робіцца сама, чым больш дарослымі становяцца яе ўласныя дзеці і мацнее матчына пачуццё адказнасці за іх. З гадамі мінулае шчыльна набліжаецца да людзей, якім уласціва пачуццё адказнасці за сучаснае, пачуццё трывогі за будучае. Магчыма таму з дня на дзень усё часцей яна ўспамінае бацьку, які нават у сне ўвесь час адчуваў сябе доктарам, гатовым у любы момант ускочыць, пачуўшы баязлівы стук у акно. Ці заўсёды ёй, дачцэ гэтага доктара з чуйным сном, лёгка звязваць клопаты пра сонца, якое павінна заліваць пакоі «Зубронка», клопаты пра хараство і плаўнасць ліній з клопатамі пра уніфікаваныя дэталі і стандартныя панелі?

Так, напэўна, можна было б спытаць у чалавека, які горача кахае: ці заўсёды табе лёгка служыць каханаму, быць для яго ўсім, чым толькі можа стаць чалавек чалавеку? Бо мы любім чалавека па тых жа законах, і сіла любові нашай да чалавека мераецца той самай меркай, што і любоў да справы, да працы сваёй. «Толькі любоў ведае, чый яна твар выпепіць. Толькі любоў накіроўвае». Вось яна, уласна, і ёсць тая кладоўка душы, дзе захоўваюцца і працавітасць, і цярплівасць, і ўпартасць, і ўсё тое, што вядзе да поспеху. Нездарма кажуць, што дзеці, якія выраслі ў сям'і, дзе бацькі глыбока і шчыра кахаюць адзін аднаго, таксама аказваюцца здольнымі на такое пачуццё. І нездарма адзін вялікі вучоны, калі ў нядаўняй дыскусіі задалі яму пытанне, што трэба для таго, каб дзеці выраслі ўдалыя, адказаў: «Шлюб па каханню!»

І. КЛІМАШЭЎСКАЯ

Акакій БЕЛЯШВІЛІ *Апавяданне*

# ЦЫЯЛА

Вёсачка Квемахеві невялікая — усяго пяць дамоў. Ніхто не ведае, у якія незапамятныя часы ўзнікла яна ў гэтых непрыступных гарах, у гэтых лясных нетрах. Завітае чужы чалавек — і дзівіцца: «Хіба людзям можна тут жыць?» А квемахеўцы ў такіх выпадках адказвалі: «Ды вось, жывем. Але толькі якое гэта жыццё!» А яно і сапраўды было цяжкае — жыццё квемахеўцаў, не ўсякаму пад сілу. Адважнае сэрца трэба мець, дужыя рукі. Паспрабуй адысціся без зброі крокаў за дваццаць ад дому ў лес, дзе шумяць адвечныя букі,— наўрад ці вернешся жывы. Можна падумаць, што звер нюхам чуе бяззбройнага чалавека,— адразу кінецца. Таму ніколі не расставаўся са сваім вялікім кінжалам Парсадан. Калі ў мужчыны пад рукой зброя — няма чаго яму баяцца. Страшна квемахеўцу толькі тады, калі ў вялікай сям'і ўсяго адна пара мужчынскіх рук. Вось чаму так горача жадаў Парсадан мець сына. Калі ў яго нарадзілася першая дачка, ён лёгка прымірыўся з гэтым, бо думаў, што у наступны раз жонка абавязкова падаруе яму наследніка, хлопчыка. Калі ж і другое дзіця аказалася дзяўчынкай, Парсадан крыху занепакоіўся. Але ўсё ж духам ён не падаў. Надзею Парсадан перанёс на трэцяе дзіця. Гэта, безумоўна, будзе сын, памочнік. Вось тады, у чатыры рукі, праца пойдзе весялей. Тады можна будзе выкарчаваць лес, пашырыць поле, а то вакол адной далані ворнай зямлі, што была ўнізе, ля ракі, заўсёды сварыліся ўсе пяць дамоў Квемахеві.

Але і на трэці і на чацвёрты раз не радаваў лёс Парсадана. Цяпер, калі віншавалі яго з нараджэннем дачкі, Парсадан са злосцю адплёўваўся і крычаў:

— Адкуль яны толькі бяруцца, гэтыя дзеўкі! Адкуль яны толькі бяруцца, гэтыя дзеўкі! Можа, думаюць, што я ім піяніна куплю? Ну, хай сабе чакаюць... Усё роўна не дачакаюцца!

Ніхто ў Квемахеві, за выключэннем Парсадана, не ведаў, што такое піяніна. Сам ён бачыў гэтую штуку толькі адзін раз, калі выпадкова трапіў у панскі двор, да князя Зураба Абашыдзе. У той дзень дваццаць чалавек прыцягнулі туды піяніна на сваіх плячах з Кутаісі. Парсадан сам памагаў унесці яго ў дом. Таму князь дазволіў Парсадану паглядзець, што будзе далей. Піяніна распакавалі, абцёрлі анучкай, і яно зазіхацела чорным лакам. Потым прысела да яго княжна Тасо, дачка Зураба, і зайграла. Але як зайграла! Нічога такога Парсадан не чуў за ўсё сваё жыццё. «Такой музыкай нас, грэшных, толькі ў раі будуць цешыць»,— падумаў ён, і яшчэ больш горкім і бязрадасным здалося ягонае жабрацкае сялянскае жыццё. Гэткая цудоўная штука тая музыка, а ён у сваёй хаце не чуў нічога, апрача пасвісту ветру, што пранікаў у шчыліны. «Вось каб сына мне, сына, памочніка!»,— аддаваўся марам Парсадан. Але гэтыя мары яго ўсё не збываліся. Жонка нараджала яму толькі дачок, і Парсадан са скрухай наракаў:

— А як жа, абавязкова ім піяніна пастаўлю, каб не ўставаць ім да таго часу! Што гэта за боская кара на гаротную маю галаву!

— Нічога, Парсадан. Пацярпі! Наступным разам жонка абавязкова народзіць табе хлопчыка,— суцяшалі яго суседзі.

— Я і сам гэтак думаю. Няўжо захоча бог пакараць мяне канчаткова? Нічым я перад ім не грэшны, нічым.

Але ішлі гады, і вось ужо дзевятую дачку прakляў Парсадан абяцаннем купіць ёй піяніна. На гэты дзевяты раз ён ледзь не нарабіў бяды,— добра, што



Мал. Ю. Пучынскага.

стрымалі суседзі. Махнуўшы на ўсё рукой, Парсадан пайшоў у лес і толькі тады крыху супакоіўся, калі забіў мядзведзя, што выпадкова нарваўся на яго. У тую ноч ён доўга не мог заснуць, змрочныя думкі пра заўтрашні дзень, пра кавалак хлеба, які няма дзе ўзяць, канчаткова змучылі беднага чалавека. «Дзевяць дачок, дзевяць жывых душ, дзевяць галодных ратоў. А я адзін. Усяго адна пара рук. Вось каб сына мне, сына!»

І вось у апошні, дзесяты раз, пачаў чакаць жаданага сына Парсадан. Добра, няхай ужо жывуць, няхай растуць дзевяць дачок, толькі хай бы цяпер паявіўся хлопчык. І калі ў дзесяты раз пачаліся родавыя схваткі ў яго жонкі і з верхняй вёскі выклікалі павітуху Саламэ, Парсадан зарадзіў драбавік і выйшаў з дому.

Як толькі крыкнуць, што нарадзіўся сын, ён зараз жа выстралам паведаміць пра гэта суседзям. Няхай усе ведаюць: Парсадану шчасце прываліла, у Парсадана наследнік!

Мінуўшы каменныя загарадкі, Парсадан спусціўся да крыніцы і прысеў на камень. Сэрца ў яго калацілася, ад нецярплівасці ён не ведаў, чым заняцца.

Дзень быў халодны, нават неба і горы пасінелі ад сцюжы, але Парсадана ўвесь час аблівала гарачынёй, шчокі пякло агнём.

Нечакана ўвагу Парсадана прыцягнулі людзі, што спускаліся па горнай сцежцы.



Кожны з іх вёў на повадзе каня. Яны не былі падобныя на тутэйшых — ні ўзбраеннем (а зброі ў іх было шмат), ні выглядам сваім. Амаль на ўсіх былі востраканечныя шапкі з чырвонай зоркай.

Падарожнікі спыніліся ля крыніцы.

— Добры дзень, таварыш! — прывітаў Парсадана адзін з іх, як відаць, камандзір атрада.

— Добры дзень! — адказаў Парсадан і ўстаў.

— Каго вартуеш? Ці можа на паляванне сабраўся? — запытаў камандзір.

— Ды не... жонка вось павінна нарадзіць... Думаю, што хлопчык будзе... тады і стрэлю ад радасці,— прастадушна адказаў Парсадан і сарамліва ўсміхнуўся.

Камандзір засмяяўся.

— Ну, а калі дачка народзіцца?

— Дачок, родны, у мяне дзевяць, і калі зараз народзіцца дзесятая,— праўду кажу, гэтай самай стрэльбай пакончу з сабою.

— Вось ты які! — сказаў камандзір. Ён зняў шапку і сеў на камень побач з Парсаданам.

— Дзевяць, кажаш?

— Дзевяць.

— Шчаслівы ты чалавек.

— Якое ж гэта шчасце? — уздыхнуў Парсадан.— Не, родны, у гэтых гарах для такіх, як я, сын неабходны, сын. Нашаму гору не могуць дапамагчы жанчыны, колькі б іх ні было ў доме. Мужчынская справа такая — з ёй жанчына не справіцца. Калі тут мужчына не будзе змагацца за жыццё, усе ад голаду падохнуць. Сам падумай, чым тут павінен харчавацца чалавек?!

Звычайна сарамлівы і нешматслоўны, Парсадан на гэты раз, нечакана для самога сябе, захапіўся і падрабязна расказаў незнаёмым пра сваё цяжкае жыццё, пра горкі свой лёс. І, магчыма, таму, што слухалі яго ўважліва і са спачуваннем, у Парсадана неяк адлягло ад сэрца. Захапіўшыся размовай, ён не адразу пачуў голас павітухі Саламэ, якая, выйшаўшы на край яго двара, адчайна клікала:

— Парсадан, гэй, Парсадан!!!

— Ну што? — збялеўшы, адгукнуўся Парсадан, пачуўшы нарэшце павітуху.— Як справы? Заслужыла абяцаны падарунак?

— Што рабіць, мой Парсадан...— загаласіла Саламэ.— Усякае дзіця — дар божы...

— Як? Зноў дачка! — усклікнуў, нібы громам разбіты, Парсадан і застыў на месцы.

— Дачушка, мой Парсадан... Такая прыгожая дзяўчынка!

Прышэльцы пераглянуліся. А Парсадан шпурнуў ружжо, схапіўся за галаву і з лямантам паваліўся на зямлю. Ён плакаў, не зважаючы на чужых людзей, горкія злосныя слёзы душылі яго, яму хацелася памерці. Навошта жыць, калі лёс канчаткова адвярнуўся ад цябе?

— Ну і дзіўны ты, дружа,— сказаў камандзір, падымаючы Парсадана.— Чалавек нарадзіўся ў цябе, радавацца ты павінен... А ты...

— Чалавек... радавацца,— усхліпваючы, мармытаў Парсадан.— Ворагам сваім не пажадаю гэткай радасці. Не, відаць, у чорны дзень народжана мая жонка... Відаць, пракляў бог яе... О божа, яшчэ дачка! Яшчэ! Можа яна думае, што я пяніна ёй пастаўлю, як князь Абашыдзе сваёй дачцэ...

— Не, дружа, ты пра гэта не бядуй. Ты хацеў перамяніць жыццё і таму марыў мець сына. Але супакойся, часы перамяніліся. Настала новае жыццё. Рабочыя і сяляне, такія ж бедныя сяляне, як ты, узялі ўладу ў свае сумленныя рукі. Зажывеш цяпер так, што сам будзеш дзівіцца свайму шчасцю. А тая дзесятая дачка — яна абавязкова будзе шчаслівая. Павер майму слову — жыць ёй у шчасці і ў радасці, тваёй дзесятай дачцэ. Дазволь, дружа, і мы, чырвоныя партызаны, будзем хроснымі бацькамі нованароджанай. Вось бачыш гэтую зорку на шапцы. Яна зазззяла цяпер над усёй нашай зямлёй, гэтая зорка, і, павер мне, ніколі не пагасне.

— Выходзіць, дзяўчынка нарадзілася пад шчаслівай зоркай,— заўважыў адзін з партызан.

— Пад шчаслівай,— пацвердзіў камандзір.— Пад самай шчаслівай. І калі ты згодзен, дружа, назавем тваю дзесятую дачку — Цыяла. Зіхатлівая! Цудоўнае імя для дзяўчынкі, што народжана для светлага і шчаслівага жыцця.

Камандзір усміхнуўся і выняў з кабуры рэвальвер.

— А цяпер вітаем нараджэнне новага чалавека, як прынята ў гарах.

Партызаны ўскінулі ўгору свае вінтоўкі, і вясёлае горнае рэха шматразова паўтарыла дружны залп. Можа таму ніхто ў Квемахеві не пачуў, як крыху пазней грымнуў выстрал і са старога парсаданава драбавіка.

***

Кажаце, састарыўся Парсадан? Дай бог вам здароўя, што можа састарыць Парсадана? Ён сам састарыць усякую старасць. Гады ідуць самі па сабе, а Парсадан жыве сам па сабе. І жыць бы яму так і жыць, калі б не гэтая праклятая слабасць у каленях. Нядаўна, калі ён збіраўся на паляванне, жонка бурчэла на яго: «Састарыўся, падурнеў, у такія гады ісці на паляванне, яшчэ звалішся ў якую бездань». «Ціпун табе на язык, старая. А зрэшты, каркай колькі захочаш. Усё роўна пайду». Нічога цяпер не баіцца Парсадан, нічога. Ён бацька дзесяці дачок, дзевяць зяцёў мае і трыццаць пяць унукаў. Гэткая сіла! Хто яе адолее?

Парсадан сядзіць на замшэлай скале побач з забітым турам і пазірае ўніз на сваю вёску. Як вырасла Квемахеві! Жартачкі: дваццаць пяць дамоў, а было калісьці пяць. Унізе раскінуліся калгасныя палі. Можа гэта толькі ў дрэнным сне было, а ўсё ж помніцца Парсадану, як за кавалачак зямлі, вунь той, што ледзь відаць там, у самым канцы поля, грызлі адзін аднаго суседзі. А як папрыгажэла Квемахеві! Як весела ззяе пад сонцам чарапіца на доме Карамана! А побач, крыху вышэй, новы Парсаданаў дом. Самы прыгожы дом у Квемахеві! Перад домам — шасэйная дарога. Яе правялі зусім нядаўна, і па ёй удзень і ўначы мчаць аўтамашыны. І ўсе, хто едзе, любуюцца домам Парсадана. І сапраўды, ёсць чым палюбавацца!

Ах, і чаго гэта толькі бедаваў Парсадан, калі ў яго нараджаліся дочкі? Усе дочкі ў старога Парсадана прыгожыя, гэта вам усякі скажа. Кожная з іх у працы ўсякага хлопца за пояс заткне. Ды што казаць, новы дом Парсадан пабудаваў пры дапамозе дачок. Але Цыяла! Не нарадуецца Парсадан са сваёй меншанькай. Нічога для яе не шкадуе. Захацела дзяўчынка вучыцца ў горадзе — паслаў. І вось скончыла дачка вучэнне, прыехала дадому, і нібы святлей стала ў хаце

Нездарма ў яе такое імя — Цыяла! Зіхатлівая! Праўду казаў тады яе хросны: пад шчаслівай зоркай нарадзілася дачка Парсадана.

Парсадан ускінуў на спіну тура і пачаў асцярожна спускацца па крутым схіле. Хацелася раней вярнуцца дадому і сёння ж увечары пачаставаць сям'ю шашлыкамі з тура.

Увайшоўшы на двор, Парсадан са здзіўленнем спыніўся. На двары стаяў грузавік, і чалавек дзесяць здымалі з яго нейкую вялізную цяжкую скрыню. Цыяла мітусілася ля машыны і ўсхвалявана прасіла ўсіх:

— Асцярожна, дарагія, не разбіце!

— Што гэта такое? — спытаў Парсадан.

Платон, старэйшы зяць Парсадана, хітра прыжмурыў адно вока і з усмешкай адказаў:

— А навошта табе ведаць, што гэта такое?.. Ого, добрага тура ты падстрэліў. Значыць, пачастуемся шашлыком?! Ды і без віна сёння не абысціся. Такая справа...

— Ды ты лепей скажы, што гэта? — прасіў стары.

— Сакрэт,— усміхнуўся Платон.— Але так і быць, табе скажу, ты ж гаспадар у доме... Гэта піяніна.

Сэрца Парсадана неспакойна забілася, лоб пакрыў пот. Спіць ён ці што? Ды не, здаецца, не спіць.

— Адкуль піяніна?

— Як адкуль? Цыяла выпісала, вось і атрымала.

— Выпісала і атрымала,— ціха паўтарыў Парсадан. Ён успомніў, як шмат гадоў назад уносілі піяніна ў дом князя Абашыдзе. Успомніў і свае дзіравыя каламаны, падраную чаху і той пякучы смутак, які выклікала ў ім тады музыка.

Скінуўшы на зямлю тура, Парсадан цяжка апусціўся на лаўку пад дрэвам. Ён сядзеў моўчкі, нерухома, нібы анямеў, і ўсё думаў пра адно і тое ж. «Піяніна»... Калісьці гэтае слова гучала ў яго вуснах як лаянка і праклён... Калісьці гэтым словам ён выказваў свой няўцешны смутак, страх перад будучым, перад галечай і галоднай смерцю... А цяпер піяніна... Выходзіць, не толькі жыццё, але і словы змяніліся.

Парсадан хутка падняўся.

— Эх, вы, разявы! Калі Зураб Абашыдзе атрымаў піяніна, я таксама ўносіў яго ў дом. Праўда, я не думаў тады, што дажыву да такіх дзён, калі гэткае дзіва ўнясуць і ў мой дом. І для каго? Для дзесятай дачкі, для Цыялы! Нездарма нарадзілася яна пад шчаслівай зоркай.— Ён схапіў абедзвюма рукамі скрыню і лёгка прыўзняў яе з аднаго краю. Цыяла шырока расчыніла дзверы, і піяніна ўнеслі ў дом.

Скрыню хутка разабралі. Пры святле лямпы піяніна заблішчэла чорным лакам. Цыяла абцерла інструмент сухой анучкай, вымела смецце і стружкі, потым прынесла крэсла, адкінула накрыўку і ўдарыла пальцамі па клавішах. Зазвінелі металічныя струны інструмента, і ў сэрцы старога Парсадана таксама ўздрыганула і зазвінела дагэтуль невядомая яму струна.

На вачах старога бліснулі слёзы, але ён тут жа змахнуў іх і ўсміхнуўся дачцэ:

— Іграй, Цыяла...

Звінелі і спявалі струны. У ціхай горнай вёсцы дзесятая дачка Парсадана, крыху адкінуўшы назад прыгожую галаву, іграла для свайго старога бацькі. А ён, прыплюшчыўшы вочы, слухаў незнаёмую музыку і паціхеньку выціраў непрошаныя слёзы.





*Будем жизнью защищать Отчизну,*
*Чтобы жизнь, как песню, воспевать,*
*Умирать с такою страстью к жизни,*
*Чтобы никогда не умирать.*

***(З дзённіка лётчыцы Любы Губінай)***

# УСЁ ВАСІЛЬКІ...

— ...І РАПТАМ над нашым аэрадромам узвілася зялёная ракета: на ўзлёт! Проста з поля, з букетамі васількоў, мы пабеглі да сваіх самалётаў. Была ў нас такая прыкмета: кветкі з сабою ў палёт ніколі не браць. Так і кінулі мы на зямлю свае васількі...

Гэта было пад Ельняй. Гэта было восенню 1943 года. Ішло наступленне на Беларусь, і дзяўчаты з 125-га жаночага авіяцыйнага палка пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў падтрымлівалі з паветра нашы наземныя войскі. Кожны дзень, а іншы раз і па некалькі разоў на дзень выляталі ў напрамку Орша — Віцебск — Багушэўск, туды, дзе была асабліва моцная абарончая лінія ворага. Вось і сёння...

— ...Здавалася, што сёння вылету не будзе. Мы пайшлі ў поле нарваць кветак. Вось-вось павінны былі адзначыць гадавіну нашага палка. Хацелася ўпрыгожыць свае зямлянкі.

Быў ціхі цёплы восеньскі дзень. Ласкава грэла сонца, зіхацелі ў паветры ніці павуціння. Нешта заспявалі дзяўчаты. І ад таго, што ў руках нашых былі кветкі,— а нашы рукі даўно ўжо не трымалі кветак, адно толькі карты, планшэты, штурвал самалёта, рукаяткі кулямётаў,— на хвіліну здалося, што нідзе больш няма вайны. Толькі на хвіліну здалося...

— І чаму гэта камандаванне ўсё адкладвае і адкладвае наша свята? Так вось і загінеш, не пасвяткаваўшы!

Гэта сказала мая лётчыца, мая лепшая сяброўка Люба Губіна. З ёй, з Любай, мы даўно ўжо лёталі разам, лёталі на Паўночным Каўказе, бамбілі аб'екты ворага пад Сталінградам — у самым пекле вайны. Люба была чалавекам стрыманым, нешматслоўным, яна была крыху старэйшая за мяне, адносілася да мяне заўсёды як да малодшай сястры, стрымлівала мае «эмоцыі».

— Спакойна, штурман,— падбадзёрвала яна мяне ў самых небяспечных сітуацыях.

Люба нарадзілася ў горадзе Хмяльніцкім, працавала на маскоўскім заводзе «Дынама» і яшчэ за некалькі гадоў да вайны пайшла ў аэраклуб, стала лётчыцай. І каханне ў яе было незвычайнае, рамантычнае — недзе на фронце змагаўся з ворагам яе муж, іспанскі лётчык Хуан.

Слова — «загінеш», такое неўласцівае Любе, трывожна прагучэла ў цішыні залатога дня, сярод рэдкіх апошніх восеньскіх кветак.

— Чаго ты, Люба?

— Сама не ведаю, чаго... Гэта ўсё васількі...

І раптам над нашым аэрадромам узвілася зялёная ракета: на ўзлёт!

...Штурман Каця Батухціна, цяпер Кацярына Якаўлеўна Ацабрык, сядзіць побач са мной у сваёй кватэры ў Віцебску і расказвае, расказвае... Няма стройнасці ў яе расказе, няма паслядоўнасці, дасюль яшчэ не ўсе раны загаіліся. «Я толькі апошнім часам пачала ўспамінаць пра ўсё больш-менш спакойна. Асабліва пра Любу. Яшчэ зусім нядаўна — не магла...» То раскажа, як сядзелі адной-чы ў вялікай зямлянцы ў самыя першыя дні, калі палком камандавала яшчэ Марына Раскова — «а ў пячурцы дагарала пунсовым золатам вуголле. Марына Міхайлаўна задуменна глядзела на яго і раптам сказала: «Я ўсіх вас апранула б пасля вайны ў сукенкі вось такога колеру... А лётчыцам толькі за тое, што асвоілі самалёт «Пе-2» (пікіруючы бамбардзіроўшчык «Петлякоў-2», ён сапраўды быў вельмі складаны ў пілатыраванні, гэты самалёт), усім без выключэння прысвоіла б званне Героя Савецкага Саюза»...

То зноў вяртаецца да падзей таго дня — падзей, што ўрэзаліся ў сэрца.

— ...Адна за адной узняліся ў паветра дзявяткі нашых эскадрылляў. Вядзе звяно наш экіпаж — Люба Губіна, я, стралок-радыст Амельчанка. Нашы «вядзёныя» — экіпажы Ані Язоўскай і Іры Асадзе. Быў загад: нанесці бомбавы ўдар па артылерыйскіх і мінамётных пазіцыях ворага пад Оршай.

Пад Оршай... Пад Оршай... Хто мог ду-

мацъ тады, што давядзецца мне калі-небудзь жыць непадалёк ад гэтага горада!

...Пад Оршай нас сустрэла агнявая заслона зенітак. Мэта ўжо зусім блізка — і раптам снарад трапляе ў левы матор нашага самалёта. Ляцім на адным... Намагаемся не адстаць ад эскадрыллі: у паветры, ведаеце, самае страшнае адбіцца ад сваіх, на цябе, як на адзінокую падбітую птушку, кідаюцца ворагі з усіх бакоў. Скідваем даволі трапна бомбы і паварочваем разам з усёй эскадрылляй назад.

Да аэрадрома яшчэ далёка, а мы ўсё больш і больш адстаем. Усё слабей і слабей цягне матор, губляем вышыню. Самалёты Ані Язоўскай і Іры Асадзе стараюцца з двух бакоў прыкрыць нашу параненую машыну. Бяру карту, вызначаю курс да бліжэйшага аэрадрома. Аня і Іра па-ранейшаму побач.

Я хачу сказаць... Вы ведаеце, што такое франтавая дружба? А дружба дзяўчатлётчыц? За ўсё сваё жыццё я ніколі не бачыла і не ўбачу, мабыць, больш святога праяўлення чалавечага пачуцця, чым тое, што было паміж нас у тыя дні. Усё можна забыць калі-небудзь, усё,— і выбухі снарадаў, і чорныя шлейфы палаючых самалётаў, і нават — боль ад цяжкіх страт. Але забыць, якія мы былі ў тыя дні дружныя і блізкія, як горача любілі адна адну, як даражылі жыццём сябровак, і не задумваліся — калі што — ні на адну хвіліну... І яшчэ... Якія ўсе нашы дзяўчаты былі сапраўдныя патрыёткі, якія яны пісьмы пісалі дамоў, якія вершы складалі! Не, такога не забыць!..

Я гаварыла ўжо, што самае страшнае ў паветры — адбіцца ад сваёй эскадрыллі. Бамбардзіроўшчык без прыкрыцця, бездапаможны, цяжка паранены,— як малое дзіця сярод звярынай зграі. Так яно і здарылася... З-за хмар на нас імгненна накінуліся два «месеры». Спачатку зайшлі ў хвост самалёта Іры Асадзе. Яна ўсё яшчэ ляціць побач з намі, усё яшчэ не адрываецца ад самалёта камандзіра звяна, прыкрывае яго агнём сваіх кулямётаў, я бачу яе твар, паранены асколкамі плексігласу, на ёй гарыць адзенне, але яна ўсё яшчэ побач з намі, зусім побач. Паранена штурман, прабіты бензабак, полымя ахапіла ўвесь самалёт. І толькі тады Ірына загадала экіпажу выкінуцца на парашутах, потым сама...

Я — штурман, я павінна бачыць усё, пра ўсё дакладваць лётчыку. Гляджу ўніз — адзін белы купал, другі, трэці... Усе... Уздыхнула з палёгкай, перадаю праз шлемафон — Любе:

— У Асадзе ўсе выскачылі.

Люба толькі моўчкі кіўнула галавой. І моўчкі, толькі вачыма пытаецца: што ў Язоўскай? Мы даўно ўжо разумелі адна адну без слоў.

Мы са стралком-радыстам вядзем агонь, і адначасова я не выпускаю з вачэй самалёт Ані. «Месеры» накінуліся на яго, як каршуны. Першая атака адбіта. Аня ўсё прыкрывае нас агнём сваіх кулямётаў. Зноў атака, і на гэты раз я бачу, як снарад разрываецца ў кабіне лётчыка. Бамбардзіроўшчык пасля крутой спіралі ўрэзваецца ў зямлю. Толькі адзін парашут бачу — гэта стралок-радыст Валя Котаў паспеў выскачыць. Люба нецярпліва чакае майго адказу. Адмоўна махаю галавой: не!.. Толькі адзін парашут. Аня Язоўская і штурман Лена Панамарова загінулі...

Не бачу, а толькі ўсім сэрцам адчуваю, як моцна сціснула Люба штурвал, як счарнеў, пэўна, яе твар... Загінулі, загінулі — адна толькі пякучая думка. Загінулі нашы дзяўчаты... Ніколі больш не засмяецца гарэзлівая наша Анечка, не кіўне прыветна галавою Лена, дзяўчына з пяшчотнымі, амаль дзіцячымі рысамі твару. Яна нечым вельмі нагадвае мне Зою Касмадзям'янскую — такі ж тонкі, адухоўлены, высакародны твар.

...Цяпер у небе мы адны. Цяпер уся зграя — на нас... Мы стралялі з Амельчанкам, стралялі з ярасцю, са злосцю, а Люба наша — выдатны, вопытны лётчык — рабіла ўсё магчымае і немагчымае, каб выціснуць з машыны, з аднаго яе матора, хуткасць, каб яшчэ крыху адысці ад ворага, выратаваць усіх нас, зберагчы машыну. Вось ужо, здаецца, мы адарваліся ад «месера» — і раптам зноў адчуваю, як трывожна павярнулася да мяне Люба. Што здарылася?

Апошні наш матор пачаў даваць перабоі, з яго пацёк струменьчык бензіну, самалёт губляў кіраванне. Яшчэ хвіліна, яшчэ — і ён рассыплецца ў паветры!

— Каця! Перадай Амельчанку, няхай пакідае самалёт! За ім ты! Я потым...

Выкінуўся Амельчанка. Я — за ім. Толькі вывалілася цераз борт — і павісла, як на крюку. Лямка парашута зачапілася за нешта.

— Каця, што там? Што ў цябе?

Я не магла чуць гэтых Любіных слоў, але яны дайшлі да маёй свядомасці. Я разумела, што гэта канец, што для мяне няма ратунку. Што думала ў тую хвіліну? Як мала давялося жыць...

На развароце Люба ўбачыла, што адбываецца са мной, і — я казала, што яна была вопытны лётчык,— адразу зразумела, чым можна выратаваць мяне. Рэзка нахіліла самалёт, каб паток паветра сам выштурхнуў мяне ў неба.

Апошні раз бачу Любін твар, твар роднага, дарагога чалавека, яе трывожны і ўсё ж задаволены, і разам з тым развітальны позірк. «Усё добра, Кацюшка,— яна так называла мяне — жыві і... бывай!» Яна была вопытны лётчык, яна разумела: ні часу, ні вышыні для яе самой цяпер ужо не застаецца.

Яшчэ ў паветры з надзеяй глянула я ў неба: не, не раскрыўся белы купал Любінага парашута... Толькі грымнуў недалёка страшэнны выбух.

Люба, Любачка...

...Былы штурман жыве цяпер у Віцебску, непадалёк ад таго месца, дзе загінулі Люба Губіна, Аня Язоўская, Лена Панамарова. Лёс закінуў яе, ураджэнку горада Чыты, сюды, на беларускую зямлю, на зямлю, якую яна вызваляла. На зямлю, дзе за Радзіму, ратуючы жыццё сяброўкі, аддала сваё жыццё Люба... Загінула так, як і пісала ў сваім вершы ў дзённіку:

> Умирать с такою страстью к жизни,
> Чтобы никогда не умирать...

У Кацярыны Якаўлеўны цяпер самая мірная ў свеце прафесія — бухгалтар. Яна вельмі сціплы чалавек, не любіць расказваць пра свае баявыя справы. Штурман — гэта праца, праца і праца... Ну і што, калі гэта праца была пад агнём, калі і карта і кулямёт, бомбы і лінейка — усё спалучалася разам? Усё роўна, гэта праца. Гэта яшчэ не подзвіг...

Пасля гібелі Любы Каця была штурманам экіпажа лётчыцы Героя Савецкага Саюза Марыі Долінай. Той самай Долінай, ва ўзнагародным лісце якой запісана:

«28 чэрвеня 1944 года тав. Доліна правадзіла бамбардзіроўку жывой сілы і тэхнікі праціўніка ў раёне Зембіна, што на паўночны захад ад горада Барысава. Заданне выканала выдатна. За дакладны бомбавы ўдар і паспяховае садзеянне наземным войскам пры фарсіраванні ракі Бярэзіна і вызваленні горада Барысава загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага палку прысвоена ўласная назва — «Барысаўскі».



**Каця Батухціна** (першая злева) **з баявымі сяброўкамі пасля паветранага параду ў Тушыне. Год 1945.**

А побач з Долінай была яе штурман... У штурмана задачы сціплыя: давесці самалёт да мэты, адбамбіцца, дакладна вызначыць курс на свой аэрадром.

...Жылі-былі дзяўчаты. Рускія, украінкі, беларускі... Лётчыцы, штурманы, тэхнікі. Тры жаночыя авіяцыйныя палкі сабрала Марына Раскова — пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў, знішчальнікаў і начных бамбардзіроўшчыкаў. Добраахвотна прынялі на сябе нежаночую, ваенную долю дзяўчаты. І ад Волгі, ад Сталінграда да неба Усходняй Прусіі прайшлі свой шлях... Сотні баявых вылетаў, дзесяткі знішчаных у паветраных баях самалётаў ворага, яго ўмацаваных аб'ектаў, тэхнікі.

Пра іх складалі легенды... Калі зімою 1944 года ў страшэнную непагадзь адна з лётчыц 125-га палка Оля Шолахава зрабіла пасадку на суседнім аэрадроме і аказалася, што гэта быў аэрадром французскай эскадрыллі «Нармандыя — Нёман», французскія лётчыкі з захапленнем глядзелі на смельчака. А калі даведаліся, што гэта дзяўчына... «Калі б можна было сабраць кветкі ўсяго свету і пакласці іх да вашых ног, нават гэтым мы не здолелі б выказаць наша захапленне савецкімі лётчыцамі»,— сказалі яны.

«Жылі-былі дзяўчаты... Маскоўскія і калужскія, сібірскія і ўральскія,— пісаў чалавек, які ведае цану мужнасці і адвагі — Аляксей Марэсьеў.— Смяшлівыя і сур'ёзныя, жвавыя і сарамяжыя. Амаль дарослыя, амаль самастойныя, яны марылі пра вялікае, яркае, цікавае жыццё, рыхтаваліся стаць інжынерамі і артысткамі, вучыць дзяцей і будаваць заводы, падарожнічаць і выводзіць новыя сарты пшаніцы. Але настала часіна выпрабаванняў — на родную зямлю ступіў вораг. У суровую часіну маці-Радзіма паклікала іх — яны надзелі салдацкія шынялі, сталі санітаркамі, будаўнікамі ўмацаванняў, зенітчыцамі, лётчыцамі... Прайшлі гады... Другія дзяўчаты, уступаючы ў жыццё, мараць цяпер аб сваёй будучыні. Дзеля іх шчасця аддавалі свае маладыя жыцці іх аднагодкі».

...У штурмана ваенных гадоў Кацярыны Батухцінай расце дачка. Сёлета яна атрымае атэстат сталасці. Яе завуць — Люба...

**А. УЛАДЗІМІРАВА**

# СІЯНІЗМ БЕЗ МАСКІ



**Ізраільскі салдат на агнявой пазіцыі ў акупіраваным горадзе Кантара** (раён Суэцкага канала).
Фотахроніка ТАСС.

Не так даўно амерыканскі часопіс «Ньюсуік», вядомы сваімі цеснымі сувязямі з сіяніцкімі коламі, апублікаваў расказ пра Голду Меір, прэм'ер-міністра Ізраіля. Невялікі тэкст (усяго на адну старонку) суправаджаўся фотаздымкамі: Меір была сфатаграфавана ў хатняй абстаноўцы. Аўтар артыкула не пашкадаваў слоў і фарбаў, каб паказаць сваю «гераіню» з найлепшага боку: яна і «пяшчотная бабуля», і «чалавек добрай душы», і «нявінная ахвяра» нейкіх пабочных сіл, якія быццам прымушаюць яе, насуперак яе жаданню, пасылаць ізраільскую моладзь у «крыжовыя паходы» супраць арабскіх краін. «Я магу амаль дараваць арабам забойства нашых сыноў, але я ніколі ім не дарую тое, што яны прымусілі нас навучыць нашых дзяцей майстэрству забіваць»,— цытуе часопіс словы Меір.

Да якой ступені ханжаства і крывадушнасці трэба дайсці, каб вымаўляць гэткія словы! Кіньце гаварыць пустое, пані Меір! Не арабы, ніхто іншы, а толькі сённяшнія правіцелі Ізраіля і іх духоўныя бацькі і натхніцелі за акіянам павінны адказваць за тое, што гінуць арабы і ізраільцяне. «Майстэрству забіваць» вучылі і вучаць махровыя сіяністы і іх апекуны і заступнікі з буйнейшых манаполій ЗША, Англіі і іншых краін. А пачалося гэта больш як семдзесят гадоў назад...

У канцы мінулага стагоддзя аўстрыйскі журналіст Тэадор Герцль апублікаваў кніжку «Дзяржава яўрэяў», якую міжнародны сіянізм аб'явіў сваім ідэйным «маніфестам». Галоўная думка гэтай «працы» зводзілася да аднаго — трэба аб'яднаць усіх яўрэяў, дзе б яны ні жылі, па расавай прыкмеце, размясціць іх у так званай «краіне запаветнай» і стварыць там «бяскласавае грамадства». Далёкі прыцэл гэтых разлікаў быў відавочны — ізаляваць працоўных яўрэяў ад рабочага руху ў тых краінах, дзе яны жывуць, і пастарацца выкарыстаць іх супраць гэтага руху, супраць усяго, што пагражае імперыялізму. Не выпадкова ў сваёй кнізе Герцль марыў аб стварэнні «яўрэйскай дзяржавы ў Палесціне» ў якасці «вала супраць Азіі», «фарпосту цывілізаванага свету супраць варварства». Ужо ў той час сіяністы, як бачым, з ахвотай гатовы былі ўзяць на сябе ролю «абаронцаў» капіталістычных устояў ад нацыянальна-вызваленчага руху, які набіраў сілы.

Дык ці варта дзівіцца, што сам Герцль быў амаль ці не лепшым другам германскага кайзера Вільгельма II і адначасова верай і праўдай служыў англійскаму каланіялізму? Стаўка была адразу на двух гаспадароў — хаця б не прагадаць!

Настаў новы час. І сіяністы перакінуліся да новага гаспадара. Заходнегерманскі часопіс «Шпігель» пісаў: «Перамога нямецкіх антысемітаў (г. зн. прыход Гітлера да ўлады) прывяла сіяністаў у надзвычайнае захапленне. Паколькі сіяністы і нацыянал-сацыялісты ўзвялі расу і нацыю ў маштаб усіх рэчаў, то між імі немінуча павінен быў узнікнуць агульны мост». І гэты мост быў наведзены. У тым ліку і на касцях соцень тысяч яўрэяў, якія былі знішчаны гітлераўцамі з маўклівай згоды сіяніцкіх завадатараў. «У час вайны,— піша член ізраільскага парламента Уры Аўнеры ў сваёй кнізе «З арабамі жыць?»,— сіяніцкае кіраўніцтва наўрад ці што-небудзь зрабіла для таго, каб выратаваць яўрэяў у заваяванай Еўропе ад знішчэння».

І зноў надышлі іншыя часы. Сіяністы зноў мяняюць гаспадара. Сусветная сіяніцкая арганізацыя, якая была створана яшчэ ў 1897 годзе і з'яўляецца цяпер галоўным арганізацыйным, фінансавым і ідэалагічным цэнтрам сіянізму, перабіраецца за акіян, у ЗША, пад крылца сваіх босаў. Амерыканскі імперыялізм разам з сіянізмам распрацоўвае злавесныя планы падаўлення дэмакратычных і вызваленчых рухаў. Адсюль цягнуцца ніці правакацый супраць краін сацыялізму, адсюль даюць каманду да ўзброеных выступленняў супраць арабскіх краін.

Сёлета ў чэрвені споўніцца пяць гадоў злачыннага, вераломнага нападу Ізраіля на сваіх арабскіх суседзяў. Гора і пакуты прынеслі захопнікі ў многія арабскія сем'і. Агрэсары даўно ўжо выкрыты і заклеймаваны сусветнай грамадскай думкай, Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый. Але да гэтага часу, страціўшы сорам і сумленне, яны сцвярджаюць, што «вымушаны» былі напасці на арабаў, каб абараніць «мірнае прыстанішча яўрэяў».

Паклёп правальваецца пры сутыкненні з фактамі. Ніхто іншы, як былы намеснік міністра абароны Ізраіля Перэс адкрыта пацвердзіў: «Да першых 80 мінут вайны наземныя войскі і тысячы пілотаў рыхтаваліся дзесяць гадоў...»

А што адбывалася і адбываецца ў Ізраілі на працягу апошніх пяці гадоў? Можа ваўкі ператварыліся раптам у ціхіх авечак? Вось што сведчыць Генеральны сакратар ЦК Кампартыі Ізраіля тав. Меір Вільнер: «З часу чэрвеньскай вайны 1967 года не спынялася кровапраліцце. Кожны дзень прыносіць ахвяры. Яўрэйская і арабская моладзь гіне ў росквіце гадоў, усё павялічваецца колькасць бацькоў, якія страцілі сваіх дзяцей, расце колькасць удоў і сірот. Нідзе ў краіне чалавек не адчувае сябе ў бяспецы... Акупацыя з'яўляецца бедствам не толькі для арабскіх народаў, але і для Ізраіля. Змагаючыся за вывад войск з акупіраваных тэрыторый, супраць жорсткага прыгнечання жыхароў гэтых земляў, мы абараняем правы і справядлівасць не толькі ў адносінах да арабскага народа. Мы тым самым абараняем бяспеку Ізраіля, жыццё нашых сыноў і дачок». Так гавораць камуністы — сапраўдныя выразнікі інтарэсаў свайго народа, якія ў цяжкіх умовах вядуць мужную барацьбу супраць крывавых авантур правячых колаў Тэль-Авіва, супраць дыверсій і правакацый сусветнага сіянізму.

«Ястрабы» Тэль-Авіва па-ранейшаму робяць стаўку на сілу. Яны ператварылі краіну ў вялізную казарму. Амаль усе мужчыны служаць у арміі 36 месяцаў, а жанчыны — 30 месяцаў. Большасць жанчын, якія не маюць дзяцей, лічыцца ў рэзерве да 34 гадоў.

Але асаблівую ўвагу сіяністы

Ізраіля аддаюць ідэалагічнай апрацоўцы маладога пакалення ў духу шавінізму, расізму, у духу пагарды да іншых нацый. На працягу 8 гадоў вучобы ізраільскім школьнікам унушаюць (і гэта займае ў агульнай складанасці 1500 гадзін!), што яны «звышчалавекі», што землі Ізраіля распасціраюцца аж да Ніла і Еўфрата. Калі падлеткам спаўняецца 14 гадоў, іх залічаюць у фарміраванні паўваенмай арганізацыі «ГАДНА». А далей — служба ў маладзёжных лагерах ізраільскай арміі. Тут будучых салдат даводзяць да патрэбных сіяністам кандыцый... І, нарэшце, ізраільская армія. Тут адмятаюцца прэч усе фігавыя лісткі. Выступаючы перад салдатамі, ізраільскі міністр Бегін без усякіх хітрыкаў павучаў: «Вы, ізраэліты, не павінны быць спагадлівымі, калі забіваеце свайго ворага. Вы не павінны спачуваць яму да таго часу, пакуль мы не знішчым так званую арабскую культуру, на руінах якой мы пабудуем сваю ўласную цывілізацыю».

Гэта ў Ізраілі. А за тысячы міль, за морамі і акіянамі, верхавод фашысцкай «Лігі абароны яўрэяў» пагромшчык Кахане заклікае, па сутнасці справы, тое ж самае ажыццявіць у ЗША. У сваёй бруднай кніжцы «Ніколі больш!» ён патрабуе ператварыць усе яўрэйскія школы і сінагогі ЗША ў ваенізаваныя цэнтры, дзе будуць навучаць метадам «каратэ, вулічных баёў і гэтак далей». Ён настойвае, каб зброя была «у кожным яўрэйскім доме», бо «яўрэйскі дом са зброяй — гэта надзейны дом». І, як звычайна, гэта праграма мілітарызацыі пераплятаецца са злосным паклёпам на Савецкі Саюз, з балбатнёй пра «заняволеных яўрэяў» у Савецкім Саюзе. Тут сіяніцкі фюрэр дзейнічае заадно з ізраільскімі сіяністамі, якія праліваюць кракадзілавы слёзы аб «лёсе» яўрэяў у нашай краіне.

Шмат гадоў назад, калі сіянізм толькі падымаў галаву, Уладзімір Ільіч Ленін ахарактарызаваў яго як рэакцыйную плынь буйной яўрэйскай буржуазіі. А хто не ведае, што дзеля захавання сваіх пазіцый, дзеля барышоў буйны капітал гатовы пайсці на любую подласць, на любое злачынства. «Калі льецца кроў, цякуць грошы»,— галасна заяўляе адзін з сіяніцкіх лідэраў Хамер.

Каб спакойна «рабіць грошы», сіяністы прапаведуюць і практыкуюць міжнародны разбой, адкрыты тэрор, вядуць злосную антысавецкую і антыарабскую кампанію, нагрувашчваючы адну хлусню на другую. Але ў хлусні, як вядома, кароткія ногі, а стаўка на браніраваны кулак, на авантуры немінуча прывядзе ізраільскіх і іншых сіяністаў да ганебнага канца.

**Г. НАВІЦКІ**

## *Мама, пачытай!*

Рыгор БОХАН

### *Хто і дзе*

**Жыве ў дупле**
**вавёрка,**
**а вожык,**
**крот —**
**у норках,**
**мядзведзька —**
**у бярлозе,**
**а качка —**
**ў вербалозе.**
**Скажы нам,**
**зайчанятка,**
**твая дзе будзе**
**хатка!**
**— Пад кусцікам,**
**ялінкай,**
**дзе сцены,**
**дах —**
**галінкі.**



Мал. С. Волкава.

### *Лясныя работнікі*

**Тук, тук,**
**тук, тук! —**
**Падсякае**
**дзяцел**
**сук.**
**Ад зары і да зары**
**ладзяць домікі**
**бабры.**
**Муравейка**
**бервяно**
**цягне,**
**ён спацеў ажно.**
**Завіхаецца**
**і крот,**
**бо арэ ён**
**агарод.**
**А сарока —**
**скок на пень**
**і лапоча**
**цэлы дзень.**

# І АЖЫВАЕ ГІСТОРЫЯ

Сюды ідуць і ідуць людзі. Тут ажывае сама гісторыя. А сутыкнуўшыся з глыбокай мінуўшчынай, лягчэй ацаніць дасягненні сённяшняга дня.

Тут ёсць што паглядзець. Вельмі многія рэчы наводзяць на роздум. Вось тоўпяцца дзеці, распытваюць:

— А чаму такая маленькая класная дошчачка?

Тлумачаць дарослыя:

— Зусім і не класная яна. Пісаць не было на чым, служыла дошчачка сшыткам. Рашыў задачу, выцер ануч-кай — зноў можна пісаць...

Смяюцца дзеці.

— Ой, няпраўду вы, дзядзечка, кажаце...

Самі глядзяць на даматканую старую торбачку.

— Гэта што, для пастушка?

— Вучнёўская...

Зноў не вераць, смяюцца. У іх вунь якія прыгожыя партфелі. Але ўсё-такі даходзіць да свядомасці — сур'ёзнымі робяцца твары. Пэўна, успамінаюцца расказы бацькоў, настаўнікаў. І ў кнігах пра колішняе жыццё даводзілася чытаць.

Што кнігі! Тут усё перад вачыма. І барана, за якой хадзілі ў лапцях бацькі і дзяды. Гаршчок з гліны, густа аплецены дротам,— так даўжэй праслужыць. Саха, свяненька, цэп...

— А як вось гэта завецца?

— Ступа. У ёй крупы рабілі. Кожны ў сваёй хаце, саматужна, каб млынару апошняе не везці, не плаціць апошнім за памол.

Пра крэсіва тое-сёе чуў, але тым не менш пытае:

— Чаму такое вышчарбленае?

— Гадоў пяцьдзесят агонь высякала. У каго былі запалкі — таго вунь як паважалі, багацеем лічылі.

Што ні экспанат — жывая гісторыя. Вось калі б кожная рэч магла расказаць сваю «аўтабіяграфію»!..

На дапамогу прыходзіць Пётр Іосіфавіч Дзеншчыкоў, старшыня калгаса. Забягаючы наперад, хочацца адзначыць: іменна гэтаму чалавеку ў першую чаргу трэба сказаць вялікае дзякуй за стварэнне багатай экспазіцыі.

Ідзем ад экспаната да экспаната. Бачым жабрацкае жыццё тутэйшых сялян да Савецкай улады, барацьбу мужных рэвалюцыянераў у час пілсудчыны, выгнанне фашысцкіх галаварэзаў з роднай зямлі... Асабліва, і бадай, самае вялікае месца адведзена працоўным поспехам калгаснікаў.

Пётр Дзеншчыкоў — нязменны старшыня калгаса. Батрак у мінулым. Дбайны гаспадар, заслужыў павагу аднавяскоўцаў, удастоены высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы. Дзеншчыкоў — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

Невысокі, дужы, жвавы, Пётр Іосіфавіч з гордасцю расказвае пра людзей, іх слаўныя справы. Камуністы заўсёды ішлі наперадзе, былі ініцыятарамі руху за асваенне новай тэхнікі, якая прыйшла на палі і фермы, за авалоданне аграномічнымі ведамі. Вось партрэты самых лепшых: трактарысты Іван Рагачоўскі, Іван Сачыўка, камбайнер Пётр Паціна, шафёр Барыс Сіцько, будаўнік Павел Пытлевіч, жывёлаводы Леакадзія Занеўская, Марыя Ціхун, Таццяна Пых.

Чацвёра авангардаўцаў узнагароджаны ордэнам Леніна, яшчэ чацвёра — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, пяцёра перадавікоў маюць медалі «За працоўную доблесць» і «За працоўную адзнаку», 76 хлебаробаў адзначаны юбілейнымі Ленінскімі медалямі.

«Авангард» вось ужо некалькі гадоў запар з'яўляецца ўдзельнікам ВДНГ СССР. Яму ўручылі на вечнае захоўванне Памятны сцяг ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета, Савета Міністраў СССР і ВЦСПС.

Расказваюць дыяграмы музея. Летась калгас атрымаў на 100 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў па 186,5 цэнтнера мяса і 472 цэнтнеры малака. Чысты прыбытак — звыш мільёна рублёў.

Расказваюць фатаграфіі. Не пазнаць вёскі калгаса — Луцкаўляны, Пракаповічы, Баброўнікі, Зяневічы. На грамадскія сродкі пабудаваны двухпавярховая школа-дзесяцігодка са спартыўнай залай, вялікая бальніца, Палац культуры, аддзяленне сувязі, сельмаг, фельчарска-акушэрскі пункт. На чарзе будаўніцтва дзіцячага сада, інтэрната, гандлёвага цэнтра, пракладка водаправода.

Глядзім на партрэт шафёра Барыса Сіцько. Жыццярадасны, вясёлы. Стаіць каля ўласнага «Масквіча». Дарэчы, адзінаццаць калгаснікаў маюць свае аўтамабілі.

Да працавітых авангардаўцаў нярэдка прыязджаюць госці з Літвы, Узбекістана, Польшчы. У кнізе водгукаў, якая беражліва захоўваецца ў музеі, яны пакідаюць запісы, поўныя захаплення.

Вось генеральны план, зацверджаны праўленнем калгаса. Ён прадугледжвае карэнную перабудову вёсак на гарадскі лад, паляпшэнне дабрабыту людзей, развіццё культурнага і бытавога абслугоўвання. Якраз тыя важнейшыя задачы, якія вызначаны ў Дырэктывах XXIV з'езда КПСС на дзевятую пяцігодку.

Музей працоўнай славы свята беражэ людскую памяць. Тут, ва ўрачыстай абстаноўцы, прымаюць юную змену ў піянеры і камсамол. Тут школьнікі лепш засвойваюць асобныя тэмы па гісторыі, літаратуры, грамадазнаўству.

Выхоўваць любоў да працаўніка і нівы — гэтыя словы найлепш характарызуюць высокае прызначэнне калгаснага музея.

**А. БЯРЖЫНСКІ**

Калгас «Авангард»,
Гродзенскі раён

# ДЗЯЎЧЫНА З ХАТЫНІЧ

Ціхім досвіткам па шырокай брукаванай вясковай вуліцы шпаркім крокам ідзе дзяўчына. У дамах калгаснікаў пад шыфернымі дахамі ўжо гараць электрычныя агні. Непадалёку, з плошчы, рэпрадуктар даносіць мелодыю «Мінскага вальса». Настае новы працоўны дзень.

— Куды гэта ты, Галька, так рана выбралася? — пытаецца ў дзяўчыны суседка, што з вёдрамі ідзе да студні.

— У Ганцавічы, цётка Шура, — крыху прыпыніўшыся, адказвае Галя. — Вучуся на курсах.

— Можа на краўчыху? — цікавіцца суседка. — А мо на якога бухгалтара?

— Ой, цётачка, не ўгадалі, — усміхаецца дзяўчына. — На трактарыстку вучуся.

— На трактарыстку?! — пляснула рукамі жанчына. — А як жа маці, бацька, не пярэчылі?

— Бацька крыху пабурчэў, але супакоіўся, а маці дык і цяпер усё сваё: не дзявочая, кажа, справа. Але я сказала: пайду — і ўсё!..

— Ганна, ці чула ты? — паставіўшы вядро ля студні, пачала цётка Шура. — Гэта ж Галька Дарахлевічава на трактарыстку вучыцца. Хіба ж у нас, у Хатынічах, хлопцаў мала?

— Старэем мы, цётка Шура, — адказала суседка. — Я сама пайшла б на гэтыя курсы, каб не гады. Цяпер, цётачка, трэба ведаць тэхніку. Без тэхнічных ведаў — як каля печы без качаргі...

І, напоўніўшы вадой вёдры, жанчыны паспяшылі дадому.

Здалёк было чуваць, як цётка Шура нешта ўсхвалявана расказвала, раз-пораз махаючы рукой.

А на аўтобусным прыпынку сярод чародкі юнакоў і мужчын стаяла з сумачкай у руках камсамолка Галіна Дарахлевіч. Яна спяшалася на заняткі вывучаць трактары-асілкі.

...Вясной дзяўчына села за руль машыны, пераважае палескія балоты ў квітнеючыя сады і нівы.

**К. САНЬКО**

Ганцавіцкі раён



Бг 5098

6210

# ПЕРШЫ НАРОДНЫ



*Да 90-годдзя з дня нараджэння народнага артыста БССР Уладзіслава Галубка*

«Тут выступаў Галубок з галубянятамі»,— такі надпіс можна ўявіць намаляваным вялікімі літарамі на сцяне клуба, нардома або пуні, дзе выступала шырока вядомая ў рэспубліцы Вандроўная трупа Уладзіслава Галубка. Трупа так і называлася ў народзе: «Тэатр Галубка».

«Галубок прыехаў!» — крычалі хлапчукі, бегаючы з хаты ў хату. «Тэатр прыехаў! — радасна паведамлялі яны.— Будзе прадстаўленне, і музыка будзе!». І людзі надзявалі свае лепшыя строі і ішлі ў тэатр Галубка як на свята. Прыходзілі і з суседніх вёсак: пагалоска, як вецер, хутка разносілася па наваколлі, і гледачы спяшаліся на спектакль.

Дзе цягніком, дзе фурманкаю, а то і проста пехатою з клункамі за плячыма, як пілігрымы, ішлі акцёры Галубка ў глыб селішчаў, каб прынесці людзям радасць далучэння да культуры і мастацтва.

Усе дэкарацыі і рэквізіт здабываліся акцёрамі на месцы. Тэатру Галубка не трэба было нічога асабліва тэхнічнага, ён мог выступаць на любым памосце і нават проста на лужку. Кіраўнік трупы Уладзіслаў Галубок выходзіў да сваёй вельмі квяцістай аўдыторыі і тлумачыў: «Вось тут будзе пакой у панскім маёнтку, а тут карчма». І гледачы, як у шэкспіраўскім тэатры «Глобус», усё разумелі і хутка засвойвалі.

Параўнанне трупы Галубка з шэкспіраўскім тэатрам «Глобус» у мяне не выпадковае. Некалі прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта А. Вазнясенскі пісаў аб трупе Галубка: «Яна дзіўным чынам нагадвае сабою гісторыю тэатральнай справы ў часы Шэкспіра... Ужо адно тое, што рэжысёр гэтага тэатра У. І. Галубок у адзін і той жа час з'яўляецца і акцёрам, які іграе галоўныя ролі, і аўтарам п'ес, якія амаль выключна ставяцца яго трупай, і дэкаратарам, бо ў большасці выпадкаў яны пішуцца ім,— усё гэта так жыва ўваскрашае абставіны, сярод якіх жыў шэкспіраўскі тэатр».

Сяляне-гледачы самі прыносілі з лесу хвойкі, бярозкі і абстаўлялі кулісы сцэнічнай пляцоўкі, а Галубок даставаў свае пэндзлі і фарбы, і на сцяне ўзнікаў бераг ракі або скляпенне замка. Раз'язджаючы па Беларусі, Галубок маляваў цудоўныя беларускія пейзажы і выстаўляў іх у Мінску на вернісажы.

Уладзіслаў Галубок рана пачаў захапляцца тэатрам. Сын чыгуначніка, ён часта ездзіў з бацькам па розных гарадах і сёлах роднага краю, глядзеў паказы на кірмашах у балаганах, захапляўся вандроўным цыркам, а калі пачаў вучыцца ў Мінскім гарадскім вучылішчы, то і браў удзел у самадзейнасці. З тых часоў ён пазнаёміўся і пасябраваў з маладым Уладзімірам Крыловічам, і яны абодва ўнеслі ў беларускае тэатральнае мастацтва каштоўны ўклад.

Трэба ведаць пра адну вельмі выдатную асаблівасць нашага народнага тэатра. У яго ішлі, звычайна, працаваць на сцэне сем'ямі. Так было ў вядомага беларускага драматурга і акцёра В. Дуніна-Марцінкевіча. У створаным ім фальварковскім тэатры ён іграў свае п'есы «Рэкруцкі набор», «Залёты», «Пінскую шляхту» разам са сваякамі і дзвюма дочкамі. Дунін-Марцінкевіч удзельнічаў у пастаноўцы оперы «Сялянка», музыку якой напісаў вядомы кампазітар Станіслаў Манюшка. Опера была паказана ў Мінску ў прыватным тэатры Поляка на Саборнай плошчы ў другой палове XIX стагоддзя. Так было і ў Ігната Буйніцкага, які выступаў са сваімі дочкамі ў створанай ім вандроўнай трупе ў Палівачах і ў Вільні, Варшаве, Мінску, Пецярбургу і шмат дзе яшчэ. Так было і ў Фларыяна Ждановіча, які разам з братам Антуком, жонкай і дачкою Ірынай (яна стала потым народнай артысткай рэспублікі) увайшлі ў тэатр «Беларускай хаткі».

Разам з «галубянятамі», гэта значыць, бабуляй, жонкай і трыма дзецьмі, Уладзіслаў Галубок пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі прыйшоў у клуб чыгуначнікаў і стварыў там трупу, якая пасля ў няспынным росце і ўдасканальванні стала Дзяржаўным Вандроўным тэатрам рэспублікі. Галубок даў беларускаму тэатральнаму мастацтву такіх цяпер шырока вядомых у рэспубліцы акцёраў, як народны артыст СССР Уладзімір Дзядзюшка, народны артыст БССР Сцяпан Бірыла, заслужаныя артысты Канстанцін Быліч, Лідзія Шынко, сёстры Тацццяна і Рыта Шашалевіч, Зінаіда Ліцкая і многія іншыя.

Сам Галубок, гэты мажны, энергічны чалавек з прыемнай усмешкай у карых вачах на адкрытым, прыветлівым твары, быў выключным па свайму яркаму таленту самародкам з народу. Сапраўды, варта толькі ўявіць чалавека, які ўвасабляў у сабе пісьменніка-драматурга, рэжысёра, акцёра, мастака — і нават музыку. Галубок, як і Крыловіч, умела валодаў многімі музычнымі інструментамі і асабліва важным для вандроўнага тэатра баянам. Ён не толькі выступаў у канцэртах-дывертысментах тэатра, але і акампаніраваў хору Нестара Сакалоўскага, іграў усё, што трэба было па ходу спектакля. Ён з ахвотаю і запалам вёў танцы разам з гледачамі, якія заставаліся пасля спектакля і не хацелі разыходзіцца, захопленыя гасцінным тэатральным прыёмам.

Жанр меладрамы быў «сапраўдным народным відовішчам»,— пісаў А. Луначарскі. Створаны ў часы Вялікай французскай рэвалюцыі, ён добра служыў народнаму тэатру, асабліва ў часе рэвалюцыі, і ў нас на Беларусі. У гэтым жанры выступалі многія беларускія драматургі, але асабліва высокага эмацыянальнага напалу і сацыяльнай яркасці ён дасягаў у творах Галубка.

Вядома, не толькі меладрамы выходзілі з-пад пяра народнага драматурга, сапраўдным камедыйным майстэрствам вызначаюцца сатырычныя п'есы Галубка «Суд», «Пісаравы імяніны», «Залёты дзяка», «Бабы-ліхадзейкі», «Жаніхі», «Культурная цешча», антырэлігійная камедыя «Пінская мадонна». Спектаклі па гэтых п'есах не толькі весялілі людзей, але і востра выкрывалі мяшчанства, забабоны, сквапнасць, ліхадзейства і розныя іншыя заганы буржуазнага побыту. Яны неслі здаровую сацыяльную мараль і мелі вялікае выхаваўчае значэнне. Яны былі вельмі даступнымі і зразумелымі людзям. Апрача сваіх п'ес, Галубок ставіў класічныя і папулярныя п'есы сучасных яму аўтараў.

Хаця тэатр Галубка часцей за ўсё выязджаў на вёску, але яго добра ведалі і любілі жыхары мінскіх рабочых ускраін: Камароўкі, Старажоўкі, Пярэспы, Ляхаўкі, чыгуначнікі Аляксандраўскай і Лібава-Роменскай дарог, рабочыя мінскіх фабрык і заводаў, чырвонаармейцы. Але прабіцца ў цэнтр тэатру Галубка ўдалося толькі пасля канчатковага вызвалення Мінска ад белапалякаў у 1920 годзе. Тады аддзел Галоўпалітасветы даў тэатру базу ў закрытым былым кафэ-шантане «Акварыум» на Крашчэнскай вуліцы. З таго часу трупа стала на дзяржаўнае ўтрыманне і лічылася Другой беларускай драматычны трупай, а з 1926 года была рэарганізавана ў Трэці Беларускі дзяржаўны тэатр рэспублікі. Уладзіслава Галубка прызначылі дырэктарам тэатра, і ён правёў удасканаленне сваёй трупы, абсталяваў памяшканне сучаснай апаратурай і рознымі выгодамі для гледача.

Новы дырэктар прыцягнуў да работы ў Трэцім БДТ такіх вядомых у рэспубліцы рэжысёраў, як Фларыян Ждановіч, Еўсцігней Міровіч, Канстанцін Саннікаў, кампазітараў Нестара Сакалоўскага, Яўгена Цікоцкага, Уладзіміра Тэраўскага, мастакоў Яўгена Ціхановіча, Заіра Азгура, Івана Ахрэмчыка.

Разам з тэатрам рос і яго глядач, і не толькі ў горадзе, але і на вёсцы, дзе ўсё больш і больш спела прага да сапраўднага тэатральнага мастацтва.

Калі зараз успамінаеш пра гэтага выдатнага мастака, выключнай энергіі і працаздольнасці чалавека, яго душэўную прыгажосць і сціпласць, то не можаш не захапляцца ім, яго высакароднасцю, талентам і жывым мысленнем. Галубок, на жаль, рана памёр (1937 г.), а мог бы пакінуць нам яшчэ большую творчую спадчыну.

**Яўген РАМАНОВІЧ**



Бе 5098
Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

# АДДАЦЬ ДЗІЦЯ...

Алена ВАСІЛЕВІЧ

Успамінаецца мне адна — цяпер ужо даўняя — мая камандзіроўка ў Віцебск. Было тады ў мяне рэдакцыйнае заданне напісаць пра мэра горада Віцебска, пра нябожчыцу Яўгенію Аляксееўну Маурыну — выдатную грамадскую дзеячку, чалавека і жанчыну выключнага хараства і абаяльнасці. Нешта з тыдзень жыла я тады ў Віцебску, ні на крок не адступаючыся ад самой Яўгеніі Аляксееўны і ад яе клопатаў і спраў. Успамінаю нялёгкі прыёмны дзень у яе службовым кабінеце.

...Нязручна спраўляючыся адной рукой з цяжкімі дзвярыма, у кабінет старшыні гарсавета зайшла наведвальніца. Другая рука яе прыціскала да грудзей белы пакунак. Наведвальніца не паспела ні прывітацца, ні прамовіць слова, як пакунак раптам заварушыўся, на ўвесь кабінет выгукнуў «ага!» і захліпнуўся прарэзлівым плачам.

— Ну, сонейка, ну, ціха, ну, не трэба...— трэсла яго маці і сама плакала, як дзіця.

З выгляду яна і сапраўды здавалася дзіцем. Кволая дзяўчынка са светлымі завіткамі на скронях і горкай крыўдай на прыпухлых дзіцячых вуснах. Дзяўчынка-маці.

Гісторыя была звычайная. Пакахала, паверыла і... асталася адна з дзіцем на руках. Без сродкаў, без помачы, без кватэры. Маці-адзіночка...

Выхад быў адзін: пакуль не акрыяе, пакуль зноў не стане на ногі, уладкаваць часова дзіця ў дом груднікоў.

Адчуўшы сэрцам жанчыны і маці чужое гора, Яўгенія Аляксееўна гладзіла тое дзяўчо па светлай галаве і зусім не як мэр горада, а як старэйшая добрая сястра, угаворвала:

— Не трэба плакаць. Маленькай там будзе добра... І з кватэрай паможам. Паможам абавязкова! Я абяцаю...

— Дык мяне ж там каля яе не будзе. Яна ж там будзе плакаць... І як жа я буду без яе жыць?..

Я, здаецца, і сёння бачу той заплаканы твар, тую роспач і адчай. Адчай і роспач маці перад жорсткай неабходнасцю аддаць роднае дзіця няхай сабе і ў клапатлівыя, але ж усё роўна чужыя рукі. Няхай сабе часова, але ж аддаць...

***

Была звычайная будзённая серада. Ішлі сваім ходам заняткі. Вучні рашалі задачы і даказвалі тэарэмы, малявалі і праводзілі хімічныя доследы ў лабараторыі. Настаўнікі ставілі адзнакі. І ўсё роўна ўзрушэнне агульнага настрою адчувалася як быццам нават у паветры. «Выбухі» чаргаваліся разам з чаргаваннем званкоў на перапынак. І тады з гіканнем імчаў раптам па калідоры атрад ліхой конніцы ў востраверхіх будзёнаўках, з шаблямі на баку... У «Штаб кіраўніцтва» адно за адным ляцелі баявыя данясенні. Сувязісты ўмоўнымі сігналамі сцяжкоў удакладнялі абстаноўку на «флангах», тапаграфічны атрад спешна здымаў «карту мясцовасці»... На сваіх месцах былі карэспандэнты — карэспандэнцкі пункт даваў аператыўную зводку і адразу ж, па гарачых слядах падзей, выпускаў «Баявы лісток».

У 5-й Мінскай школе-інтэрнаце праводзілася гульня «Зарніца». Праводзілася па ўсіх правілах вайсковага і выхаваўчага майстэрства. «Галоўнакамандуючым» гульні быў выкладчык гісторыі і выхавацель у 7-м класе Уладзімір Цімафеевіч Платонаў.

...Я люблю бываць у школах, люблю назіраць імклівае, як у вуллі, зладжанае школьнае жыццё, яго норавы і парадкі, яго невычэрпную шматграннасць. У школах-інтэрнатах жыццё гэта, у дадатак, мае яшчэ і сваё, асаблівае, цячэнне на глыбіні. Адразу гэтае глыбіннае цячэнне не разгледзіш, не разгадаеш. У школе-інтэрнаце дзеці не толькі вучацца, як у звычайнай школе. Тут яны жывуць. І таму школа-інтэрнат павінна стаць для іх домам і сям'ёю. У яе сценах дзіця павінна знаходзіць згубленую радасць маленства... У вельмі складаным працэсе стварэння гэтай радасці выхавацель павінен непазбежна ўдзельнічаць усімі сваімі ведамі, усім сэрцам і, што не менш важна,— штодзённай адданасцю і прыкладам. Іншых варыянтаў, іншых сакрэтаў у выхаванні не існуе.

Вось пра гэта мы і гаварылі ў 5-й Мінскай школе-інтэрнаце з Уладзімірам Цімафеевічам Платонавым, чалавекам, захопленым сваёй справай і сваім прызначэннем — ствараць тое, чаго пазбаўлены яго выхаванцы дома, у роднай сям'і.

...Ці ведаеце вы, што самыя цяжкія дні ў школе-інтэрнаце — гэта субота і панядзелак? У суботу выхаванцам дазваляецца пайсці і ўвесь выхадны дзень прабыць дома з роднымі. У панядзелак яны зноў вяртаюцца ў школу-інтэрнат на цэлы тыдзень. Аднак дадому, да родных на выхадны ідуць не ўсе дзеці. У суботу ў куточку вестыбюля вы можаце ўбачыць гаротнага маленькага чалавека з клуначкам у руках і з вачыма, поўнымі чакання і цяжкіх дзіцячых слёз. Ён хоча дадому. Ён чакае, што па яго абавязкова прыйдуць, што яго абавязкова забяруць (маленькіх, да чацвёртага класа, адных — без бацькоў і старэйшых каго — дадому не адпускаюць). У панядзелак гэты маленькі чалавек усё тым жа нявыплаканым журботным позіркам будзе бязмоўна страчаць сваіх сяброў, якія вяртаюцца ў школу-інтэрнат з дому...

Дом і родныя забіраюць на выхадны не ўсіх дзяцей.

***

У мяне было дэпутацкае заданне наведаць сям'ю, дзе бацькі і дзеці... Адным словам, цяжкую сям'ю. Савет грамадскасці пры домакіраўніцтве прымусіў бацькоў Аляксандра Яфімавіча і Наталлю Адамаўну Кульша аддаць сваіх дзяцей на выхаванне ў школу-інтэрнат. Іне — сямікласніцы — 14 гадоў. Сямігадовая Леначка ходзіць у першы клас. Самім бацькам 38 гадоў і 36.

Што ж здарылася, што павінна было адбыцца ў сям'і, дзе здаровыя, у самым росквіце мужчына і жанчына, бацька і маці, раптам пазбавіліся самай вялікай радасці — і пазбавіліся, заўважце, прымусова?

Прызнаюся, я баялася стрэчы з гэтым чужым горам. Баялася матчыных слёз і пакуты ў вачах бацькі. У думках, ідучы на гэту сустрэчу, я шукала сродкаў, як памагчы гэтаму гору.

...Гаспадар адчыніў мне дзверы ў няпалены непрыбраны пакой, які, здаецца, аглух ад грому тэлевізара. Перад блакітным экранам сядзела дзяўчына, абцягнутая вузкімі штонікамі,— кватарантка. Хворая бабуля глядзела тэлевізар, лежачы ў пасцелі...

Самой гаспадыні, Наталлі Адамаўны, дома не аказалася. Яна знаходзілася на прымусовым лячэнні ад алкагалізму ў Навінках.

Слёз і вялікага гора не было. Аляксандр Яфімавіч Кульша не здаваўся ні зласлівым, ні помслівым. Ён проста быў пакрыўджаны. Падумаць толькі, узяць і вось так, нізавошта, аддаць некаму амаль 90 рублёў! Быццам яны яму самому з неба ўпалі. (Прыйшло грашовае спагнанне са школы-інтэрната на ўтрыманне дзяцей.) Як нейкім там бабам, дык тым толькі па восем рублёў усяго і платы на месяц (і тае яны не плацяць), а як яму дык па паўсотні за кожную... Як быццам ён прафесар які ці дырэктар. А яму самому на што жыць? А тут яшчэ тэлевізар узяў у крэдыт...

Аляксандр Яфімавіч асабліва напіраў на тэлевізар. А ён так роў на ўвесь гэты няўтульны пакой, што мне хацелася добра грукнуць па ім чым-небудзь цяжкім.

— Ды ліха з ім... Няўжо ён гэтак ужо вам патрэбны?— Я не здолела сябе стрымаць.

— Ну, ведаеце... Без тэлевізара здурнееш.

Атрымлівалася так, нібыта мы з ім размаўляем на розных мовах.

— Вялікую ласку яны мне зрабілі, што забралі дзяцей... Быццам за гэтыя грошы я сам бы іх дома не дагледзеў.

— Але ж не дагледзелі. Дзеці ж вашы не выпадкова і не па сваёй віне ў школе-інтэрнаце.

— Дык гэта ж усё суседзі... Удалі!

— Суседзі таксама вінавацы, што вашу жонку паклалі на прымусовае лячэнне?

— Падказалі ў міліцыю. Мы якраз з гасцей вярнуліся... Ну і...

Падобна было, што мы зноў збіваліся на розныя мовы. Потым Аляксандр Яфімавіч зноў вяртаўся да самай балючай для яго тэмы: гэтулькі грошай плаціць за дзвюх дзяўчынак! Каб жа іх хаця там даглядалі, а то ж і ў той бок ніхто не глядзіць. І вухам не вядзе, ці накормленыя дзеці, ці вучаць яны ўрокі... Гойсаюць, дзе хто хоча, яшчэ красці панавучваюцца...—тут ужо ён абураўся, як самы прыкладны і клапатлівы бацька.

— Ну а калі б плату за дзяўчынак скасавалі ці хоць бы зменшылі—тады ці згадзіліся б вы іх трымаць у школе-інтэрнаце?

— Што за пытанне! Хто ж бы тады не згадзіўся? Няхай бы сабе вучылі, няхай бы даглядалі. Я ж не кажу, што там невукі якія сядзяць ці злачынцы—тыя выхавацелі. Яны ж на тое і пастаўлены там, за тое жалаванне там атрымліваюць.

Паўтараю, ён не быў ні зласлівы, ні помслівы. Яго не задавальняла толькі адно: плата. Такая плата! Каб вось хаця як тым «бабам»—па восем рублёў за дзіця...

Потым гэтак жа незласліва ён збіраўся ўзяць развод з жонкай. Адразу ж, як толькі вернецца яна з лячэння. Тады ён і дзяцей падзеліць: адна мне, адна табе. Каб клапацілася. Каб ведала, як піць... Як быццам сам ён зроду ў рот не браў кроплі, як быццам клопат пра гэтых дзяцей быў асноўным сэнсам яго жыцця.

А неўзабаве ён забываў і ўжо сам заступаўся за жонку: «Ну і што, калі пераходзіла з месца на месца? Не падабалася ёй, дык і мяняла работу. Затое якую важнецкую спецыяльнасць мела—мантажніца!»

І сапраўды: жонка мела важнецкую спецыяльнасць. Мантажніцай на радыёзаводзе пачынала. А потым як пайшло, як пайшло... На працягу дваццаці працоўных год Наталля Адамаўна 20 (!) разоў па «ўласнаму жаданню» кідала адну работу і пераходзіла на новую. Гэта не маё сцвярджэнне—гэта сцвярджэнне яе працоўнай кніжкі.

Так вось склалася жыццё ў гэтай сям'і. Адно было толькі суцяшэнне, што дзяцей на выхаванне забрала школа-інтэрнат.

***

У 5-й васьмігадовай школе-інтэрнаце выхоўваюцца трое дзяцей Цыбульскіх. Оля—у восьмым класе, Валя—у сёмым, «Гена-Цыбулька»—самы меншы—у пятым. Старэйшая, Таня, перайшла ў 4-ты інтэрнат у дзевяты клас.

У Цыбульскіх бацька памёр, маці за п'янства, за распусту пазбаўлена судом мацярынскіх правоў. Нядаўна вярнулася з турмы. А на дзяцей «чужыя людзі»—выхавацелі, настаўнікі, уся школа—не нацешацца: здольныя, ласкавыя, цудоўныя дзеці! Страшна падумаць нават, якое патрэбна мець сэрца жанчыне-маці, каб не ўспомніць, не прыйсці, не даведацца: як яны там, без яе ж мацярынскай ласкі выраслі... Няўжо ніколі не прачынаецца сумленне, ніколі не баліць сэрца?

Пазбаўлены мацярынскіх правоў за разгул, за гарэлку маці Леаненка і Куракова, іх дзяцей выхоўвае 5-я школа-інтэрнат. Не пажадаў вярнуць правоў бацькі, хоць меў магчымасць, і матэрыяльную і па закону, Барыс Вольман, дваіх дзяцей якога таксама вучыла і даглядала гэта школа...

Траіх дзяцей забралі ў школу-інтэрнат — прымусова забралі—у бацькоў Галаўко. Сам «галава» працуе ў Мінводаканалтрэсце слесарам. Маці Галаўко—на шарыкападшыпнікавым заводзе. За дзяцей, хоць заработкі выходзяць па 150—160 рублёў у месяц, не плацяць ні капейкі. Усё ідзе на гарэлку і на распусту.

І жывуць усе гэтыя людзі не ў лесе, не ў чыстым полі. Яны штодня сустракаюцца са сваімі суседзямі, ходзяць з імі па адной сцежцы, працуюць у нейкім калектыве. І няма ні сораму, ні сумлення... Маючы здароўе, сілу—збыць на чужыя рукі роднае дзіця, дваіх дзяцей, траіх—і працягваць існаваць... Я не кажу: жыць. Існаваць. Але дзеля чаго? У імя якой мэты?

І аднаго толькі баяцца пакарання: паперкі, якая напомніць пра неабходнасць плаціць грошы ў школу-інтэрнат на ўтрыманне ўласных дзяцей... Якое нікчэмнае жыццё! Якое бяссэнсавае існаванне!

...І ўсё роўна ніколі не гаварыце кепска з дзецьмі пра іх бацькоў. Не рабіце дзецям балюча. Не забывайце, што ў кожнага дзіцяці яго родныя маці і бацька заўсёды «самыя лепшыя»...

Не разбівайце гэтай надзеі.



Магазін, які называецца «1000 дробязей». За прылаўкам Наташа Бабpоўская.

Жанчына і быт

# РЭЧЫ ВАКОЛ НАС

Вы любіце хатнюю ўтульнасць? Не хочаце траціць марна свой час? Вы нераўнадушныя да прыгожых рэчаў? Наўрад ці многія тысячы пакупнікоў, якія наведваюць наш магазін, адкажуць адмоўна на гэтыя пытанні. Безумоўна, ім хочацца жыць у максімальна прыемных умовах, у акружэнні карысных і патрэбных памочнікаў — зручных і прыгожых рэчаў.

Профіль нашага магазіна «1000 дробязей» непасрэдна адпавядае гэтай мэце — несці людзям утульнасць і выгоды. Па тым, як з году ў год расце папулярнасць магазіна, нам няцяжка прасачыць, як павышаецца пакупная здольнасць насельніцтва, больш патрабавальны робіцца наш пакупнік, як, нарэшце, мяняецца выгляд тавару, што мы прадаем.

Прыемна прапанаваць сёння прыгожую бялізну фабрык «Камсамолка», імя 8-га сакавіка, «КІМ», панчохі, шкарпэткі, калготкі віцебскай і брэсцкай фабрык. Апошнім часам з'явілася шмат тавараў шырокага попыту, якія раней прадаваліся ў абмежаванай колькасці. Усе, напэўна, памятаюць, як два-тры гады таму назад цяжка было знайсці ў гаспадарчых магазінах электрасокавыціскалку, сокаварку, кантэйнер для хлеба, гусятніцу, марожаніцу, дзіцячыя калготкі. Цяпер іх хапае. З'явіліся ў большым выбары люстры, падвесы і абажуры, прыгожа аформленыя аэразольныя фарбавальнікі, асвяжальнікі, сродкі для барацьбы з насякомымі, для догляду мэблі, абутку.

Выконваючы пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па забеспячэнню далейшага развіцця вытворчасці тавараў масавага ўжытку», многія буйныя прадпрыемствы рэспублікі пачалі выпускаць рэчы, якія не з'яўляюцца для іх асноўнай прадукцыяй. Тавары гэтыя атрымалі прызнанне пакупніка: кантэйнер для хлеба, зроблены на аўтамабільным заводзе, вызначаецца прыгожай формай, надзейнасцю і зручнасцю. Вялікі попыт на замкі, зробленыя на заводах аўтаматычных ліній, падшыпнікавым, трактарным, шмат заявак на мясарубку Магілёўскага завода «Чырвоны металіст», прыгожыя і патрэбныя туалетныя шафкі выпускае завод «Калібр». Зручныя карнізы з тросавым прыводам выпрабляе завод электрахаладзільнікаў. Прыемна будзе парадаваць пакупніка

# ПОБАЧ З МАМАЙ

Піянерка, пра якую я хачу вам расказаць, не ўзрывала варожых эшалонаў, не падкладвала мін пад склады зброі, не страляла ў эсэсаўскіх афіцэраў. Яна была вельмі малая для такіх спраў: Тамары яшчэ не споўнілася адзінаццаці гадоў, калі пачалася вайна. Яна была маленькая, худзенькая, ціхая дзяўчынка і любіла гуляць у лялькі.

Жыла тады сям'я Осіпавых у старэнькім двухпавярховым драўляным бараку. Ён і цяпер там стаіць, на тым жа месцы, адзін сярод каменных гмахаў, цэлы пакуль што барак. І вулачка тая старая захавала ранейшую назву: вуліца Кавальская, дом № 7.

На другім паверсе гэтага дома ў маленькім пакойчыку жыла сям'я Осіпавых. Чэрвеньскім ранкам у яе спакойнае жыццё ўварвалася жудаснае слова «вайна».

Ніколі не забыць Тамары той дзень, калі яна ўпершыню на свае вочы ўбачыла, як распраўляліся фашысты з савецкімі ваеннапалоннымі.

Немцы вялі іх пад канвоем па вуліцы Чкалава. Босыя, знясіленыя ад голаду і катаванняў ішлі байцы, апусціўшы галовы. Некаторыя ледзь перастаўлялі ногі.

Тома стаяла на тратуары і бачыла палонных зусім блізка. Маленькае сэрца сціснулася ад болю. Што яна магла зрабіць?.. У кошыку ляжала буханка чорнага хлеба. Не вагаючыся, Тома кінулася ў натоўп палонных, разламала буханку, парассоўвала ў працягнутыя рукі. Да яе бег раз'юшаны канваір. Тамара бачыла: ён быў ужо блізка, як раптам адзін з палонных упаў. Зусім маладзенькі белагаловы хлапчына. Таварышы падхапілі яго пад рукі, ён падымаўся і зноў падаў. Калона спынілася. Шалёны канваір павярнуўся да яго, штосьці крыкнуў па-нямецку, ускінуў аўтамат.

Грымнуў выстрал...

— Забі-і-ў!..— Тома закрычала, кінулася ў натоўп жанчын. Яе абступілі, закрывалі рот рукамі:

— Не крычы, а то яны і цябе заб'юць, гэтыя вылюдкі!

Неўзабаве пасля гэтага выпадку прыйшла да Марыі Барысаўны адна яе даўнейшая знаёмая, Антаніна Аляксееўна Сокалава, расказала, што сустрэлася з групай нашых байцоў — афіцэраў і салдат, якія выйшлі з акружэння. Яны знаходзяцца ў лесе, каля вёскі Целякова Уздзенскага раёна. Сярод іх ёсць параненыя. Яны ў страшэнным становішчы: гнояцца раны, няма ніякіх медыкаментаў.

Думалі... Перабралі ўсіх знаёмых, хто меў калісьці адносіны да аптэчных спраў. Вырашылі: трэба звязацца з Любоўю Ісакаўнай Іргер: яна ўрач, працавала ў бальніцы. Але яна ў «гета».

Нашылі сабе на грудзі і на спіну жоўтыя латкі і рушылі... У «гета» знайсці Любоў Ісакаўну было лёгка — яе ведалі ў Мінску. Яна не стала доўга распытваць, дала лякарствы, бо разумела, дзеля каго магла так рызыкаваць Марыя Барысаўна.

Так пачала сваю канспіратыўную дзейнасць дзяўчынка Тома. Арганізавалася падпольная антыфашысцкая група, важаком якой стала «Чорная» (падпольная клічка М. Осіпавай).

Тамара расла не па гадах назіральнай, разумнай дзяўчынкай. Яна хутка здагадалася, чым былі заняты знаёмыя ёй і незнаёмыя людзі, якія прыносілі і выносілі нейкія таямнічыя скруткі. Прачнуўшыся ўначы, яна бачыла, як мама, не запальваючы святла, ходзіць па пакоі і ўсё думае, думае пра нешта... Яна разумела, навошта мама пайшла наймацца ў прыбіральшчыцы да немцаў: ёй трэба было атрымаць «аўсвайс» — пропуск, які дазваляў выходзіць з дому, калі сцямнее. Марыя Барысаўна вярнулася разгубленая, яе не ўзялі, сказалі: «старая».

— Я пайду, мама!..

Мама здзіўлена зірнула на сваю дзяўчынку, потым моцна прыціснула яе да сябе:

— Цябе не возьмуць, дачушка, ты малая яшчэ! — На вачах у яе былі слёзы.

Мінула крыху часу, і разумная, знаходлівая дзяўчынка стала надзейнай памочніцай маме ў яе небяспечнай рабоце; маленькая, кволая на выгляд, яна лёгка магла прайсці незаўважаней там, дзе дарослы чалавек абавязкова прыцягнуў бы ўвагу.

Ёй пачалі даручаць адказныя заданні. Трэба ўзяць лістоўкі на Заслаўскай вуліцы, аднесці на Грушаўскі пасёлак і аддаць каму трэба («не забудзеш пароль?»). Або пранесці праз ачапленне ў кошыку, прыкрытым анучамі, разабраны рэвальвер. Разнесці па явачных кватэрах радыёзводку, падпольную газету... Хто ўсё гэта зробіць лепш за Тому?..

І дзяўчынка рабіла. Каля завода імя Варашылава (цяпер ён носіць імя Кастрычніцкай Рэвалюцыі) знаходзіўся канцлагер, дзе фашысты трымалі савецкіх ваеннапалонных. Пра гэты лагер смерці хадзілі страшэнныя чуткі. Падпольшчыкам удалося наладзіць уцёкі. Уначы смельчакі перарэзалі калючы дрот. Пакуль вартаўнікі знайшлі лаз і паднялі трывогу, чалавек дваццаць пяць паспелі выбрацца і былі ўжо далёка.

Уцекачоў развялі па надзейных кватэрах. А праз пару дзён Тамара пачала групамі, па некалькі чалавек, выводзіць іх з горада. Яны ішлі ў лес, да партызан.

Зразумела, яны не ішлі за Тамарай па вуліцы натоўпам. Тут усё было старанна прадумана. Томе давалі дакладны план, як дзейнічаць: «Пойдзеш па такой вось вуліцы, каля гэтага дома. Адтуль цябе ўбачаць з акна. Праз некалькі мінут з дома выйдзе чалавек і пойдзе ўслед за табой...»

---

навінкамі трактарнага завода — вядомы ва ўсім свеце гігант нядаўна асвоіў выпуск набораў кухонных прылад і вельмі пакуль што дэфіцытную каструлю-скараварку.

Але ў жыцці існуе пэўная заканамернасць: чым большыя матэрыяльныя магчымасці насельніцтва, тым вышэйшы попыт. Тое, чым мы маглі задавальняцца ўчора, ужо не імпануе нам сёння. Мы пачалі жыць багацей, іншымі сталі густы, і патрабуецца ўсё больш тавараў масавага попыту, выдатных па якасці. І вельмі крыўдна, калі мусіш у нечым адмаўляць пакупніку, які хоча ўнесці ў свой дом яшчэ адзін элемент утульнасці. Хатні ўтулак, як сцвярджаюць знаўцы інтэр'ера, псіхолагі, урачы і проста хатнія гаспадыні, складаецца з тысячы прыгожых і мэтазгодных рэчаў, якія палягчаюць працу, упрыгожваюць быт. А мы адказваем «няма» пакупніку, які прыйшоў да нас купіць простую загатоўку для ключа, запасныя часткі да электрабрытвы, тэрмас, кнопкавы ўключальнік, электрагрэлку, ізаляцыйную стужку... Пералік дэфіцытных на сённяшні дзень тавараў яшчэ даволі вялікі.

Няўжо так цяжка асвоіць вытворчасць складаных драўляных метраў або ватэрпасаў?! А хіба Барысаўскі шклозавод імя Ламаносава не можа выпускаць запасныя колбы для тэрмасаў ды і самі тэрмасы? Чаму мы павінны чакаць, калі прывязуць электрагрэлкі з Украіны і падцяжкі з Прыбалтыкі? Чаму навасёлы бегаюць па гораду, шукаючы мэблевыя цвікі, і не могуць знайсці?

Аднастайнасць прыгнятае. Але ж мы самі спрыяем гэтай аднастайнасці, і многія кватэры па свайму ўнутранаму ўбранню нагадваюць адна адну, бо ў тысячах сем'яў набываюць аднолькавыя свяцільнікі, каструлі, вешалкі, палічкі.

Асобна хочацца сказаць наконт драўляных дробязей быту. Можа калісьці пакупніку была па душы простая танная палічка. Сёння ён хацеў бы купіць даражэйшую, але паліраваную, прыгожа зробленую, бо дома ў яго дарагі паліраваны гарнітур. Такіх палічак, падставак, палічак для тэлефона, для шчотак, зробленых па высокаму класу, у нас няма.

Кожная рэч хатняга ўжытку мае пэўную мэтазгодную форму. Але і гэтыя рэчы трэба ўдасканальваць адпаведна новым умовам. Напрыклад, каструлі з ежай мы трымаем у халадзільніку, бо няма спецыяльных тэрмасаў. Але накрыўка каструлі не зусім зручная: ручка вытыркаецца наверх, і няма як ставіць адну пасудзіну на другую. Не шкодзіла б удасканаліць патэльню. Кошык для бялізны мае толькі адну форму, а яго ж можна было б зрабіць інакш, больш зручна. А шчотка для абутку? Хіба нельга прырабіць да яе ручку, каб не пэцкацца крэмам? Чайнік мог бы выпускацца са свістком і не адной формы, якая ўжо надакучыла ўсім.

У магазіне з'явілася апошнім часам белая эмаліраваная пасуда. Я ўжо не кажу, што яе мала, што яна адгружаецца ў танажы і пераважна ў буйных адзінках. Але ж гэтая пасуда не мае ніякіх упрыгожанняў, якія маглі б парадаваць вока гаспадыні. Эстэтычнай кухні ў нас ніхто не займаецца.

Прадпрыемствы, якія выпрацоўваюць прадметы хатняга ўжытку, слаба прыслухоўваюцца да голасу пакупніка. Шмат гадоў паступаюць скаргі на якасць прасаў Гродзенскага завода: тэрмарэгулятары ў іх, як правіла, працуюць дрэнна. Але за гэтыя гады якасць іх не палепшылася. Мінскі завод халадзільнікаў асвоіў вытворчасць карнізаў з тросавым прывадам. Чамусьці выпускаюцца яны толькі белага колеру, што не заўсёды задавальняе пакупніка. Наша просьба фарбаваць іх у розныя колеры пакінута без увагі. Няма ў продажу чахлоў на коўдру размерам

І вось праз гадзіну-паўтары за дзяўчынкай ішлі ланцужком тры-чатыры чалавекі, трымаючыся на вялікай адлегласці адзін ад аднаго. Тома выводзіла іх на Ракаўскае шасэ да ўмоўленага месца, дзе чакаў яе сувязны з партызанскага атрада.

Аднойчы Тома ішла сярод белага дня па вуліцы, на якой адбывалася аблава,— немцы правяралі ва ўсіх дакументы. Тома вярталася з явачнай кватэры. Пад лёгкай летняй сукеначкай яе цела было абкручана нямецкай сакрэтнай ваеннай картай. Тома прынесла яе дадому, а ўвечары па карту прыйшоў сувязны з партызанскага атрада.

К канцу 1942 года фашыстам ужо было добра вядома імя падпольшчыцы «Чорнай», яны шукалі яе ўпарта і апантана. Марыя Барысаўна не начавала дома. Па некалькі дзён яна разам з Томай хавалася ў яўрэйскім «гета» або ў каго-небудзь з сяброў. Міналі аблавы, вобыскі, арышты, наставала зацішша, і Тома бегла на вуліцу Кавальскую даведацца, як там справы. Суседка, Ліда Дзяменцьева, паведамляла: «Мама можа прыйсці». Яны вярталіся ненадоўга, пакуль зноў не пачнуцца арышты.

Але вось аднойчы ўвечары, пасля Кастрычніцкага свята, прыйшоў да Марыі Барысаўны малады хлопец Валодзя. Ён добра ведаў нямецкую мову і па заданню камітэта працаваў у ворага слесарам, таварышы ведалі яго пад клічкай «Водаправодчык». Ён прыйшоў папярэдзіць Марыю Барысаўну, што фашысты дазналіся адрас і заўтра раніцой прыйдуць па яе.

— Калі не знойдуць вас, дык забяруць Тамару,— дадаў Валодзя.— Уцякайце зараз жа.

Пакідаць Тамару ў горадзе было ўжо нельга. Як толькі развіднела, яе адправілі за 150 кіламетраў ад Мінска да цёткі.

А Марыя Барысаўна непрыкметна выйшла з дому, пайшла па гародах, па завулках і неўзабаве была ў надзейным укрыцці ў сваіх сяброў. Ёй трэба было яшчэ здзейсніць вялікія гераічныя справы, за якія яна ўдастоена звання Героя Савецкага Саюза...

Падпольная група, якой кіравала Марыя Осіпава, прывяла ў выкананне некалькі надзвычай важных дывярсій. Самая значная з іх — знішчэнне обер-ката беларускага народа Вільгельма фон Кубэ. Партызаны ўзарвалі звера ў яго логаве — у спальні.

Неўзабаве пасля гэтага самалёт павёз Осіпаву і іншых удзельнікаў дыверсіі ў Маскву.

...Цяпер Тамара Якаўлеўна Осіпава сама ўжо мама. Жыве яна ў сваім родным горадзе Мінску і працуе ў медінстытуце, выкладае англійскую мову.

За заслугі перад Радзімай яна ўзнагароджана некалькімі медалямі, сярод якіх і медаль «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» II ступені. Але яна не расказвае пра гэта, а калі пачынаеш распытваць, здзіўляецца:

— Ну што я асаблівага зрабіла?.. Памагала маме... У вайну ўсе былі героямі. Таму мы і перамаглі фашызм.

**Тамара ЦУЛУКІДЗЕ**

---

150×210 сантыметраў, хоць у свой час было прададзена шмат коўдраў такога размеру.

Многія рэчы не карыстаюцца попытам, бо іх падводзіць афармленне: дрэнны ўпаковачны матэрыял, няўдалая маркіроўка. Некаторыя нашы тавары па сваёй якасці нікольі не ўступаюць імпартным, але побач з імі выглядаюць бедна. Многія з радасцю купілі б у падарунак сумку фабрыкі імя Куйбышава, але каробку, у якой яна паступіла ў магазін, няёмка дарыць віноўніцы ўрачыстасці.

Мы ўжо гаварылі пра зручную і яркую ўпакоўку аэразольнай бытавой хіміі, якая выпускаецца ў Прыбалтыцы. На жаль, мыючыя сродкі Барысаўскага завода, Баранавіцкага хімкамбіната і іншых выходзяць у сумнай шэрай упакоўцы, не вытрымліваюць ніякага параўнання з прыбалтыйскімі. Дрэнна і груба маркіруюцца драўляныя вырабы Лагойскага, Браслаўскага і іншых прамкамбінатаў. А марка прадпрыемства — гэта яго твар, яго аўтограф, па ім у пакупніка складаецца ўяўленне аб работніках, якія выпускаюць прадукцыю.

У сябе ў кватэры чалавек праводзіць большую частку жыцця. Тут гаспадыня гатуе ежу, тут дзеці вучаць урокі, тут прымаюць гасцей і сяброў, тут адпачываюць і тут працуюць. Далёка не ўсё роўна, у якой абстаноўцы ўсё гэта адбываецца, якія рэчы нас акружаюць. І калі мы сёння гаворым: «усё для чалавека», то, безумоўна, маем на ўвазе, што наш дом, наш быт стане крыніцай выдатнага настрою. А гэта ў немалой меры залежыць ад рэчаў, якія выпускаюцца для нас.

**Р. ПАКАТАВА,**
**дырэктар магазіна «1000 дробязей»,**
**г. Мінск.**

# ЭКРАН



Кадр з кінафільма «Сіняе неба».

**...У адной паўднёвай краіне ўрад, перш чым заключыць кантракт на пастаўку грузавых машын, наладжвае конкурсныя гонкі па цяжкапраходных дарогах. У гонках прымае ўдзел і наш МАЗ. Савецкі гоншчык трапляе ў бальніцу, і за руль садзіцца прадстаўнік Мінскага аўтазавода інжынер Віктар Логінаў...**

**А пра тое, што адбылося далей, гледачы даведаюцца, прагледзеўшы новую шырокаэкранную мастацкую кінастужку «Міравы хлопец», створаную на кінастудыі «Беларусьфільм» паводле сцэнарыя Ціхана Няпомняшчага.**

**Галоўныя ролі выконваюць Мікалай Алялін, Харый Ліепіньш, Любоў Румянцава, Мухтар Маніеў, Мікалай Яроменка.**

* * *

**Шырокаэкранная мастацкая кінакарціна «Месяц жнівень» — твор «Ленфільма». Аўтар сцэнарыя Альбіна Шульгіна, рэжысёр - пастаноўшчык Вадзім Міхайлаў.**

**Прыехаў у родныя мясціны Аляксей Крашэннікаў і засумаваў па гораду. Ды яшчэ і жонка тут, на роднай зямлі, раптам стала па-маладому непрымірымая да непавагі. да здрады. І бацька чамусьці нездаволены сынам, яго абыякавай лёгкасцю ў адносінах з людзьмі... Але штосьці пачынае мяняцца ў характары Аляксея. Прыезд гарадской каханкі не прыносіць радасці, а рашэнне жонкі адпусціць яго робіцца пачаткам новага кахання да яе.**

**Галоўныя ролі выконваюць Аляксандр Плотнікаў, Вера Кузняцова, Ія Савіна, Сяргей Шакураў.**

* * *



Кадр з кінафільма «Афіцэр запасу».

**Будуць дэманстравацца мастацкая кінастужка «Калі разыходзіцца туман» вытворчасці кінастудыі «Масфільм» (пра барацьбу з браканьерамі), грузінская каляровая кінакарціна «Даісі» (экранізацыя аднайменнай оперы Захарыя Паліяшвілі), казахская кінаповесць «Атака» (пра тэхнічную інтэлігенцыю Казахстана), фільмы Адэскай кінастудыі «Сіняе неба» (пра ўрачоў, якія вяртаюць людзям зрок) і «Чортаў тузін» (пра свабодалюбнае запарожскае казацтва).**

* * *

**З замежных кінафільмаў можна будзе прагледзець «Ты і я і маленькі Парыж» (ГДР), «Пасля цемры святло» (Арабская Рэспубліка Егіпет), «Прыгоды ў Антарыо» (Румынія і Францыя), «Кветка персіка» (Мексіка), «Чарвен і Скралан» (Швецыя), «Леў зімой» (Англія), «Загнаных коней забіваюць, хіба не праўда?» (ЗША).**

**Р. КРОПЛЯ.**

Кадр з кінафільма «Даісі».



# ГРУЗІНСКІЯ СТРАВЫ

## ХАЧАПУРЫ



500 г. маласольнага сыру добра размяць (калі сыр салёны, то замачыць у вадзе на некалькі гадзін, а потым выціснуць) і заправіць адным яйкам.

Замясіць на сыраквашы не вельмі крутое цеста з пшанічнай мукі, падзяліць цеста на дзве часткі і раскачаць. Пакласці на кожную роўным слоем падрыхтаваны сыр і зашчыпаць сарцавіну. Хачапуры пакласці на гарачую патэльню (хачапуры павінен адпавядаць размеру патэльні), абсыпаную мукой, і спячы з абодвух бакоў. Хачапуры можна спячы таксама ў духоўцы.

## СУП ЧЫХІРТМА

Тлустую курыцу заліць халоднай вадой і зварыць. Гатовую выняць з булёну, пакласці на талерку і пасыпаць соллю. З паверхні булёну зняць тлушч і патушыць у ім дробна пакрышаную рэпчатую цыбулю (5 галовак) да мяккасці. Затым дадаць 1 сталовую лыжку пшанічнай мукі, зноў тушыць 10 мінут, разбавіць шклянкай гарачага булёну і выліць у каструлю з



булёнам. 3—4 яйкі добра збіць, змяшаць з невялікай колькасцю астылага булёну і ўліць у каструлю, загадзя зняўшы яе з агню. Булён увесь час памешваць, каб не адкіпеў. Потым дадаць дробна нарэзанае зяленіва, вінны воцат і соль па смаку.

## САЦЫВІ

Тлустую тушку курыцы нарэзаць, пакласці ў каструлю, пасаліць і патушыць. Калі мяса падрумяніцца, дадаць 4—5 га-



ловак дробна пакрышанай рэпчатай цыбулі.

Ачышчаныя грэцкія арэхі (200 г) стаўчы з соллю, дадаць па смаку тоўчаныя часнок, кіндзу (калі ёсць), стручковы перац, для гушчыні 1 ст. лыжку кукурузнай мукі, усё гэта развесці шасцю шклянкамі гатаванай вады, уліць у каструлю з мясам і, памешваючы, варыць 20—25 мінут. За 5 мінут да гатоўнасці пакласці 1 лаўровы ліст, молатую гваздзіку (3 шт.), 1/4 чайнай лыжкі карыцы і, калі ёсць,— шафран і сухія супелі (маладыя сушаныя пахучыя расліны). Пад канец дадаць па смаку вінны воцат.

## ЛОБІО З АРЭХАМІ

500 г лобіо (фасолі) зварыць у вадзе. За паўгадзіны да гатоўнасці дадаць дробна пакрышаную рэпчатую цыбулю — 3 галоўкі і 2—3 галінкі сельдэрэю. Калі лобіо зварыцца, адвар зліць у асобную пасуду.

Ачышчаныя грэцкія арэхі (1 шклянка), 5 галінак кіндзы, 2 зубкі часнаку, стручковы перац і соль па смаку — разам стаўчы, развесці 1/2 шклянкі гранатнага соку (або сталовай лыжкай віннага воцату), усё гэта змяшаць з варанай фасоляй і добра перамяшаць. Гатовае лобіо пакласці на блюда і пасыпаць зярнятамі гранату, пятрушкай, цыбуляй.

## ШАШЛЫК-БАСТУРМА



Мяса нарэзаць на невялікія кавалачкі, пасыпаць молатым чорным перцам, соллю, пакрышанай рэпчатай цыбуляй, перамяшаць і паставіць у халодным месцы. Праз некалькі гадзін, а можна і праз 3—4 дні кавалкі мяса надзець на шпажку і смажыць над распаленым вуголлем без полымя, увесь час паварачваючы шпажку.

Падаваць на стол можна і на шпажцы, і на блюдзе, упрыгожыўшы кольцамі цыбулі і скрылёчкамі лімона.

# ЯКІ ЦУДОЎНЫ СКАРБ!



Вуліцы Мінска даўно не бачылі так арыгінальна апранутых жанчын: квяцістыя хусткі завязаны неяк адмыслова, блузкі аздоблены яркай вышыўкай. Гасцямі сталіцы былі 22 ткачыхі з вёскі Неглюбка Веткаўскага раёна. Яны прыехалі на выстаўку, дзе экспанаваліся цудоўныя рэчы, зробленыя іх умелымі рукамі: ручнікі, абрусы, капы, вытканыя на самаробных станках-кроснах. Ніводзін з 120 вырабаў не з'яўляецца копіяй, кожны па-свойму прыгожы і арыгінальны.

Арнамент ручнікоў стылізавана-раслінны і геаметрычны. Назва асобных дэталей чыста народная: кучараўкі, крывулі, казлы, мядзведзі, рэдзька. Дэталі паўтараюцца, але кожная майстрыха апрацоўвае іх па-свойму. Даўжыня ручніка каля чатырох метраў, ён аздоблены вузкімі карункамі. Арнамент вытканы на двух канцах, астатняя частка зуткана вузкімі палоскамі. Асноўны колер — чырвоны, чорны, белы, але апошнім часам майстрыхі пачалі ўводзіць зялёны, сіні, жоўты.

Старанна і беражліва захоўваюць самабытнасць народнага мастацтва ткачыхі Неглюбкі. У вёсцы, дзе трыста двароў, ткацтвам займаюцца 56 жанчын. Усе яны працуюць у саўгасе даяркамі, даглядчыцамі жывёлы, прыбіральшчыцамі, а ў вольны час садзяцца за кросны. Ефрасіння Якаўлеўна Суглоб, Ганна Рыгораўна Грынькова, Марыя Сцяпанаўна Каўтунова, Таццяна Фёдараўна Дзяронак, Марыя Аляксееўна Прыходзька, Еўдакія Сцяпанаўна Барсукова — удзельніцы многіх абласных, рэспубліканскіх і ўсесаюзных выставак. Ганна Рыгораўна Грынькова ахвотна вучыць маладых майстрых. Маці-гераіня Марыя Паўлаўна Каўтунова (у яе 10 дзяцей, з іх пяцёра школьнікаў) пры ўсёй сваёй занятасці знаходзіць час, каб не толькі самой сесці за кросны, але і назіраць за першымі поспехамі сваіх дачок.

Да гэтага часу ў Неглюбцы захоўваюцца народныя традыцыі, дзяўчаты павінны наткаць у пасаг сабе ручнікоў. На вяселлі сваякі нявесты развешваюць ручнікі ў хаце жаніха і адорваюць імі шаноўных гасцей.

«Вялікае дзякуй за ваша цудоўнае майстэрства, выключнае разуменне колеру, багацце арнаментыкі. Яркая самабытнасць, прыгажосць вашых ручнікоў, настольнікаў, посцілак, дываноў здзіўляе ўсіх. Імі захапляецца ўся беларуская сталіца,— пісалі мінчане ў кнізе водгукаў.— Любая непагадзь можа стаць сонечным святам, калі будзе магчымасць бачыць такі цуд...»

**А. КРАСІЧКАВА,**
**старшы метадыст рэспубліканскага Дома мастацкай самадзейнасці Белсаўпрофа**

— Ці карыстаюцца інваліды працы правам бясплатнага праезду на гарадскім транспарце?—пытаюцца чытачы М. Зуйкоў з гор. Клімавічы, А. Бабачонак з Барысава і іншыя.

Пастановай Савета Міністраў БССР ад 21 ліпеня 1969 г. № 246 «Аб прадастаўленні асобным катэгорыям пасажыраў права бясплатнага праезду на гарадскім пасажырскім транспарце» інвалідам, якія не маюць абедзвюх рук ці абедзвюх ног, інвалідам, якія не маюць рукі і нагі, інвалідам з паралічам дзвюх канечнасцей, а таксама асобам, якія суправаджаюць сляпых, прадастаўлена права бясплатнага праезду на ўсіх відах гарадскога пасажырскага транспарту (за выключэннем таксі) ва ўсіх гарадах Беларускай ССР.

**А. ХВАСТОЎ,**
**кандыдат юрыдычных навук**

## КАНСУЛЬТАЦЫЯ ЮРЫСТА



Ба 5098

# ГУМАР



Знаходлівы бацька.



— Даражэнькая, а ці выключыла ты прас?
— Не турбуйся. Я яго з сабою ўзяла.



Без слоў.

Малюнкі А. Чуркіна.

## ОРДЭН СЕЛЬСКАМУ ПАШТАЛЬЁНУ

Альбіне Цыруль, сельскаму паштальёну, уручылі ордэн «Знак Пашаны». Яна абслугоўвае вёскі Круплі і Яськавічы, самыя аддаленыя ад цэнтра калгаса «17 верасня».

Зімой і летам, у мяцеліцу і дождж ад двара да двара ідуць дарогі сельскага паштальёна. Сялянскія сыны і дочкі працуюць у многіх кутках нашай Радзімы інжынерамі, урачамі, настаўнікамі. У Апанаса Аляксеевіча Сасноўскага шасцёра дзяцей, і ўсе разляцеліся з роднага гнязда, і ўсе пішуць пісьмы бацькам. У Пятра Казіміравіча Спургаша дачка Ядвіга — сакратар абкома камсамола, Галя — медсястра, Зоя — аграном, сын Леанід — шафёр, працуе ў родным калгасе. Ды і ў самой Альбіны Іосіфаўны сем братоў і сясцёр.

Альбіна Цыруль актыўны грамадскі распаўсюджвальнік газет і часопісаў, стараецца абудзіць у людзей цікавасць да друкаванага слова. Нездарма ў яе атрымлівае газеты і часопісы кожная сям'я.

Я. МАКОЎСКІ,
супрацоўнік райгазеты

Гродзенская вобласць,
Іўеўскі раён.

### АДКАЗЫ НА КРАСВОРД, ЗМЕШЧАНЫ У № 4

1. Ямал. 2. «Маці». 3. Авал. 4. Анна. 5. Трал. 6. Філі. 7. Фтор. 8. Кода. 9. «Абай». 10. Ліса. 11. Іней. 12. Кіпр. 13. Прут. 14. Трук. 15. Борт. 16. Саго. 17. Брас. 18. Атам. 19. Руда. 20. Ажур. 21. Гага. 22. Лось. 23. Міль. 24. «Аіда». 25. Жыта. 26. Рыга. 27. Алоэ. 28. Ліра. 29. Сіла. 30. Арка. 31. Корт. 32. Ікра. 33. Адан. 34. «Хлеб». 35. Герц. 36. Пірс. 37. Корд.

На першай старонцы вокладкі. **Прыём у піянеры. Калгас імя Карла Маркса, Слуцкі раён.**

Каляровае фота У. Вяхоткі.



## КРАСВОРД „МАЯ БЕЛАРУСЬ“

**По гарызанталі:** 1. Народны мастак БССР, кіраўнік праекта «Курган Славы». 4. Першы беларус — Герой Савецкага Саюза. 8. Аўтар сцэнарыя мастацкага фільма «Дзесятая доля шляху». 10. Прыток Прыпяці. 11. Вядомы беларускі оперны спявак, заслужаны артыст БССР. 14. Зборнік апавяданняў Міхася Лынькова. 17. Кампазітар, аўтар музыкі да кінафільма «Пасеялі дзяўчаты лён». 18. Адзін з аўтараў архітэктурнага ансамбля ў Мінску — «Ленінскі праспект». 19. Вядомы беларускі кінааператар. 20. Паэма Аркадзя Куляшова. 23. Раённы цэнтр Віцебскай вобласці. 25. Паэт-песеннік, аўтар песні «Мінскія сосны». 26. Прыток Бярэзіны. 30. Вядомы дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. 32. Твор Янкі Маўра. 33. Спартсмен, адзін з мацнейшых у свеце кідальнікаў молата. 34. Гарадок Гомельскай вобласці. 35. Беларускі дзіцячы часопіс.

**Па вертыкалі:** 1. Неаднаразовы чэмпіён СССР па стральбе з пісталета. 2. Балет Яўгена Глебава. 3. Адзін з архітэктараў мемарыяльнага комплексу «Хатынь», лаўрэат Ленінскай прэміі. 5. Рапірыстка, сярэбраны прызёр IV юбілейнай Спартакіяды народаў СССР. 6. Прыток ракі Мухавец. 7. Раённы цэнтр у Магілёўскай вобласці. 9. Беларускі скульптар. 12. Таленавіты арганізатар партызанскай барацьбы на Віцебшчыне, Герой Савецкага Саюза. 13. Выканаўца ролі старшыні калгаса ў кінафільме «Шчасце трэба берагчы». 15. Член экіпажа танка, які першым уварваўся ў горад Барысаў пры яго вызваленні, Герой Савецкага Саюза. 16. Знатны старшыня калгаса на Талачыншчыне, Герой Сацыялістычнай Працы. 21. Вядомая беларуская легкаатлетка, прызёр Рымскай алімпіяды. 22. Знатная работніца трактарнага завода, Герой Сацыялістычнай Працы. 24. Спецыялізаваны кандытарскі магазін у Мінску. 27. Самае вялікае возера ў БССР. 28. Прыток Нёмана. 29. Народная артыстка БССР, выканаўца ролі Мальвіны ў кінафільме «Несцерка». 31. Аўтар аповесці «Жарцы».

Склаў Л. МАСЛОЎСКІ

**Галоўны рэдактар М. І. КАРПЕНКА. Рэдакцыйная калегія: М. М. БАРСТОК, А. С. ВАСІЛЕВІЧ, М. А. ЖЫДОВІЧ, М. С. КОНАНАВА, Р. У. КУДРЭВІЧ, Л. П. МАРЫНКЕВІЧ, Р. С. ПІЁНАВА, А. П. УС, В. А. ЧАРНЯЎСКАЯ.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Ленінскі праспект, 77.
Тэлефоны: галоўнага рэдактара — 32-20-51, адказн. сакратара, аддзела прамысловасці — 32-38-14, аддзелаў сельскай гаспадаркі, культуры, быту — 32-38-24.

**Мастацкае афармленне Ю. У. Пучынскага.**
**Тэхнічны рэдактар І. А. Цылаў. Карэктар І. Л. Паўлава.**

Журнал «Работница и крестьянка»
на белорусском языке. Издание ЦК КП Белоруссии.

АТ 08264. Здадзена ў набор 1/IV-72 г. Падпісана да друку 24/IV-72 г. Друк. арк. 5,5. Аўт. арк. 7,3. Фармат 60×90 $^1/_8$. Дадатак — выкрайка. Тыраж 373 969 экз. Зак. 863. Цана 15 кап.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Мінск.

Ба 5098

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна















# МОДА

Цана 15 кап.

74995